Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 113 (27723) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пісьменнік з вечным болем СТАР.5

Сямейная газета

Аперацыя «зберагчы адносіны»

Дзевяць «я» — адна сям'я

ЦЫТАТА ДНЯ

Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Што датычыцца пытання павелічэння пенсійнага ўзросту, то ў цяперашні час такія захады прадпрымацца не будуць. Грамадская думка сведчыць пра тое, што людзі негатыўна ставяцца да такіх працэсаў».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 20°
Віцебск	+ 18°
Гомель	+ 18°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 18°
Мінск	+ 19°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.06.2014 г.

Долар ЗША	10170,00	■
Еўра	13780,00	▼
Рас. руб.	292,00	▼
Укр. грыўня	851,22	▼

ISSN 1990 - 763X

ЯК НА ПАРАД

1944-2014 70 гадоў вызвалення

Падрыхтоўка да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў знаходзіцца на стадыі завяршэння. У самым разгары — рэпетыцыя парада войскаў Мінскага гарнізона.

У ваенным парадзе возьмуць удзел больш як 3700 вайскоўцаў і каля 240 адзінак баявой тэхнікі. Традыцыйна ўрачыстае шэсце адкрыюць суворaўцы. Упершыню на сталічным праспекце з'явіцца калона «партызанаў». У адпаведнай экіпіроўцы, з унікальнымі ўзорамі рарытэтнай зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны яны пройдуць, як некалі іх продкі.

— У гісторыі Вялікай Айчыннай вайны наша краіна заўсёды была рэспублікай-партызанкай, — падкрэсліў вайсковы камендант Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь палкоўнік Анатоль ГРЫЦАЎ. — Прысутнасць «партызанаў» у парадзе вельмі сімвалічная: роўна 70-гадоў таму партызаны ўдзельнічалі ў парадзе ў гонар вызвалення Мінска. Таму было прынята рашэнне ўключыць у склад парада і «каробку», якая ўвасабляе партызанскі рух Беларусі.

Адразу пасля пешых разлікаў перад глядацкімі трыбунамі пройдзе тэхніка часоў Другой сусветнай вайны, будзе прадэманстравана і сучасная тэхніка, якая знаходзіцца на ўзбраенні беларускага войска. У парадзе на Дзень Незалежнасці возьмуць удзел таксама вайскоўцы Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі. Завершыцца ўрачыстае шэсце пляц-канцэртам зводнай роты ганаровай варты і выступленнем зводнага ваеннага аркестра.

Чым запомніцца святочны парад і як будуць здзіўляць гледачоў арганізатары мерапрыемства — у падрабязным рэпартажы спецпраекта «Плацдарм» у бліжэйшых нумарах «Звязды».

Вераніка КАНЮТА.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

■ На свае вочы

НА ПАМЕЖЖЫ І РАЗДАРОЖЖЫ…

«Каб у нас усё было, а нам за гэта нічога не было». Гэты жартоўны тост стаў рэфрэнам паслярэвалюцыйных чаканняў нашых паўднёвых суседзяў

А яшчэ адзін яны выконвалі хорам: «Вас, беларусаў, мы так чакаем, так любім!» Дарэчы, ёсць за што. У лепшыя часіны два рынкі горада-пабраціма Гомеля спецыялізаваліся, без усялякіх двукоссяў, на ўзаемавыгадных стасунках менавіта з пакупнікамі суседняй дзяржавы. А значыць, шмат жыхароў поўначы Украіны жыло за кошт гандлю з бліжэйшымі беларускімі раёнамі. Пасля вядомых падзей струмень шопінг-турыстаў амаль вычарпаўся. Між іншым, на карысць айчыннай эканомікі. Лозунг «Купляйце беларускае!», нарэшце, пачаў працаваць. СТАР.7

■ Ёсць праблема!

КАЛІ НЕ Ў СМЕТНІЦУ, ТО КУДЫ?,

або Як зберагальная лямпачка ператвараецца ў разаральную

Фота Надзеі БУЖАН.

Энергазберагальныя лямпачкі выкарыстоўваюцца паўсюдна, але разам з эканоміяй нясуць у сабе прыхаваную небяспеку. Як толькі «змейка» адпрацавала сваё, яе трэба акуратна ўтылізаваць — яны месцяць у сабе ртуць. Але дзе прымаюць небяспечныя адходы?

Скрыня на мільён

Сёлета эколагі стварылі інтэрактыўную інтэрнэт-падказку greenmap.by — карту Беларусі з нанесенымі на ёй пунктамі па зборы другаснай сыравіны: батарэек, макулатуры, старога адзення. СТАР.6

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫКАНАННЕ ПРАГНОЗАЎ

Урад публічна зробіць справаздачу перад Прэзідэнтам па выніках работы эканомікі ў I паўгоддзі

Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, каментуючы пасяджэнне Савета бяспекі аб праблемных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця, якое адбылося напярэдадні ў кіраўніка дзяржавы, паведамляе БЕЛТА.

Па словах прэм'ера, Прэзідэнт паставіў перад урадам канкрэтныя задачы. «У нас ёсць прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця, мы павінны забяспечыць збалансаваны бюджэт і, безумоўна, тэмп росту валавога ўнутранага прадукту 103,3%. Прэзідэнтам прынята рашэнне па выніках паўгоддзя публічна заслухаць справаздачу ўрада аб выкананні паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і бюджэту», — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

Ён дадаў, што самае галоўнае, на што звярнуў увагу Прэзідэнт, — гэта якасны рост эканомікі, які мусіць быць забяспечаны. «Для гэтага мы павінны, па-першае, больш актыўна працаваць на экспарт, таму што ў нас уся эканоміка арыентавана ў асноўным на знешнія рынкі. Па-другое, павінна быць рэнтабельная работа прадпрыемстваў, якая, безумоўна, забяспечваецца ў тым ліку і праз зніжэнне складскіх запасаў, — сказаў прэм'ер-міністр. — Таму захапленне валавымі паказчыкамі некаторых прадпрыемстваў вядзе да таго, што ствараюцца досыць вялікія аб'ёмы складскіх запасаў».

Таксама ў Прэзідэнта абмяркоўваліся пытанні занятасці, заработнай платы. Яна, як было адзначана, павінна дакладна адпавядаць узроўню прадукцыйнасці працы. «Мы крыху палепшылі цяпер у параўнанні з мінулым годам суадносіны росту рэальнай заработнай платы і прадукцыйнасці працы, але ўсё адно ў рэальным сектары эканомікі яна апярэджвае рост прадукцыйнасці працы, — сказаў кіраўнік урада. — Хоць сёлета ўдалося знізіць матэрыялаёмістасць і энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту і прамысловай вытворчасці ў цэлым».

ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА — ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ГРАМАДСТВА

Учора адбыўся ўрачысты пленум праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечаны 80-годдзю з дня заснавання творчага аб'яднання.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вітанне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з нагоды юбілея зачытаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Радзькоў. Сярод іншага прагучала і наступнае азначэнне сутнасці літаратурных задач, іх суадносін з грамадскім, усенародным жыццём: «Беларускія пісьменнікі заўсёды з'яўляліся выразнікамі думак, пачуццяў і спадзяванняў свайго народа. Так было і ў перыяд ваеннага ліхалецця, і ў гады пасляваеннай адбудовы, і сёння. Таму вельмі важнай задачай застаецца патрыятычнае выхаванне грамадства, найперш маладога пакалення, на аснове традыцый гісторыі, нацыянальнай культуры».

Аляксандр Радзькоў, адзначаючы многія здабыткі ў гісторыі беларускай літаратуры ўвогуле, шмат увагі ў сваім выступленні надаў зменам, што адбываюцца ў мысленні нашага сучасніка, у цяперашнім грамадстве. Як ніколі відавочнымі здаюцца патрэбы і ў зменах пісьменніцкага мыслення, у больш пільнай увазе пісьменніка, творчага чалавека да няпростых павеваў часу.

Старшыня СПБ Мікалай Чаргінец, падкрэсліўшы многія здабыткі, шмат гаварыў і пра задачы, пра патрэбы і клопаты, якія паэтам, празаікам, крытыкам, публіцыстам неабходна вырашаць разам з усім народам. Вялікая група пісьменнікаў была адзначана самай высокай узнагародай грамадскага аб'яднання — медалём «За вялікі ўклад у літаратуру».

Сяргей ШЫЧКО.

■ Парламенцкі дзённік

КРОКІ ДА РЭАЛЬНАСЦІ

ДЭПУТАТЫ ЗАКЛІКАЛІ ЎРАД РАБІЦЬ БОЛЬШ ЯКАСНЫ ПРАГНОЗ ПА ДАХОДАХ БЮДЖЭТУ

Учора Палата прадстаўнікоў ажыццявіла свае кантрольныя паўнамоцтвы па выкананні бюджэту за мінулы год. На чарговым пасяджэнні чацвёртай сесіі два законапраекты датычыліся справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту і бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Абодва фінансавыя дакументы на працягу года падвяргаліся карэкціроўкам.

ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ ЭКАНОМІКІ

Летась удакладнены план па даходах рэспубліканскага бюджэту быў выкананы на 100,8%, а па расходах — на 99,6%. Дэфіцыт склаў амаль Br2,257 трлн, гэта значыць, 0,4% да ВУП. Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту ў 2013 годзе быў выкліканы праблемамі з экспартам калійных угнаенняў, якія ўзніклі да канца года.

Доля расходаў на нацыянальную абарону склала прыкладна Br6,236 трлн (98,7% удакладненых гадавых значэнняў), на судовую ўладу, праваахоўную дзейнасць і забеспячэнне бяспекі — Br10,895 трлн (99,6% планавых значэнняў). На ахову здароўя было выдзелена Br4,679 трлн (99,6% удакладненага плана), на фізкультуру, спорт і СМІ — больш як Br1,9 трлн (97,8% удакладненага плана), на адукацыю — Br5,743 трлн (99,9%).

— Наша скліканне ўжо другі раз зацвярджае справаздачу па выкананні бюджэту, і абодва разы (ужо праглядаецца тэндэнцыя) даходная частка не выконваецца, адбываецца яе карэкціроўка, — заўважыла **член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Вольга ПАЛІЦІКА.** — Адна з асноўных прычын — недасягненне запланаванага ўзроўню прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

«Якія канкрэтныя крокі прымаюцца, каб наша бюджэтнае планаванне было больш набліжаным да рэчаіснасці?» — спытала дэпутат **намесніка міністра фінансаў Максіма ЕРМАЛОВІЧА,** які прадстаўляў дэпутатам законапраект. Намеснік міністра растлумачыў, што часта ў прагноз закладваюцца даволі аб'ектыўныя ацэнкі, але беларуская спецыфіка ў тым, што эканоміка краіны залежыць ад сітуацыі з экспартам і імпартам, ад цэн на энерганосьбіты, газ, нафтапрадукты, калійныя ўгнаенні, ад стану фінансавых рынкаў. Гэтая залежнасць і прыводзіць да сур'ёзных карэкціровак. Напрыклад, такі ўплыў зрабіў на эканоміку Беларусі канфлікт на калійным рынку ў 2013 годзе.

— Якасць прагназавання павінна заключацца ў тым, каб мы не закладвалі штогод нейкі залішні аптымізм, — дадаў Максім Ермаловіч. — Заўсёды хочацца закласці больш высокія тэмпы, разлічыць пад гэтыя тэмпы бюджэт, сфарміраваць планы, але потым прыходзіцца іх вельмі балюча і цяжка карэкціраваць. Лепш вызначыць мінімальны аб'ём магчымасцяў бюджэту. Сфарміраваць на падставе гэтых даных расходную частку, а ўжо ў працэсе выканання, атрымліваючы дадатковыя даходы, накіроўваць іх у адпаведнасці з прыярытэтамі, якія вызначае кіраўнік дзяржавы і парламент.

Дэпутаты высветлілі, што пры фарміраванні бюджэту на 2015 год рэвалюцыйных змен не будзе, але будуць эвалюцыйныя. «Наколькі глыбока мы зможам прапрацаваць фінансавую праграму на бліжэйшыя тры гады, залежыць не толькі ад Міністэрства фінансаў, але і ад кожнага распарадчыка бюджэтных сродкаў, і ад галіновых міністэрстваў эканамічнага блока, — патлумачыў намеснік міністра. — Таму што неабходна спрагназаваць і цэнавыя, і інвестыцыйныя параметры, што зрабіць дастаткова складана. І тут не хапае закона аб індыкатыўным планаванні».

ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ ПЛАНАВАННЯ

Такі закон дазволіць фарміраваць бюджэт на некалькі гадоў наперад. Маецца на ўвазе план на адзін базавы год і на два наступныя. Сам Мінфін да такой работы гатовы, запэўніў намеснік міністра. У галоўным фінансавым ведамстве лічаць, што пераход да такога планавання вельмі важны, таму што гэта фарміруе яснасць. Пад сярэднетэрміновы фінансавы план лепш планаваць дзяржпраграмы. Не будзе праблемы разбалансаванасці паміж жаданнямі і магчымасцямі.

У сваю чаргу, **старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** паведаміў, што законапраект аб індыкатыўным планаванні, як чакаецца, будзе ўключаны ў план падрыхтоўкі праектаў законаў на наступны год. «Арыенціровачны тэрмін паступлення законапраекта ў Палату прадстаўнікоў — лета 2015 года», — удакладніў спікер. Раней такі праект закона паступаў у парламент, але быў адкліканы ўрадам.

ДЗЕЛЯ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯ

Беларускія дэпутаты на ўчарашнім пасяджэнні таксама прынялі ў першым чытанні ўнясенне змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы па пытаннях бяспекі суднаходства маламерных суднаў.

Як растлумачыў, прадстаўляючы законапраект, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Леанід МАЖЭЙКА,** дакумент істотна ўдакладняе тэрміналогію ў сферы ўнутранага воднага транспарту. Пашыраюцца паўнамоцтвы МНС Беларусі як органа, які ажыццяўляе рэгуляванне ў сферы бяспекі суднаходства маламерных суднаў на ўнутраных водных шляхах краіны.

Паводле слоў Леаніда Мажэйкі, унясенне папраўак накіравана ў першую чаргу на недапушчэнне выпадкаў гібелі або траўмавання грамадзян. «У Беларусі не так даўно былі гучныя выпадкі гібелі людзей, звязаныя з выкарыстаннем маламерных суднаў», — нагадаў парламентарый.

У сувязі з гэтым ён заўважыў, што законапраект прапануе рэгуляванне пытанняў кіравання маламернымі суднамі, патрабаванняў да іх суднакіроўцаў, указвае выпадкі для забароны на эксплуатацыю такіх суднаў.

У сваю чаргу **намеснік міністра па надзвычайных сітуацыях Аляксандр ГАНЧАРОЎ** звярнуў увагу, што законапраект прадугледжвае карэкціроўку Кодэкса ўнутранага воднага транспарту Беларусі. У прыватнасці, прадугледжваецца магчымасць удзелу грамадзян у забеспячэнні бяспекі суднаходства маламерных суднаў у форме пазаштатных інспектараў. «У законапраекце вызначаны патрабаванні да пазаштатных інспектараў, а таксама іх паўнамоцтвы», — адзначыў Аляксандр Ганчароў.

Усяго дэпутаты разгледзелі 10 законапраектаў, з якіх пяць — у першым чытанні.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Акцыя

НАША ЗЯМЛЯ — У НАШЫХ РУКАХ!

Пад эгідай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў Бярозаўскім раёне прайшла акцыя па ўстойлівым выкарыстанні тарфянікаў у сельскай гаспадарцы.

17 чэрвеня — сусветны дзень барацьбы з апустыньваннем. Гэтая праблема датычыцца і Беларусі. У нашай краіне глеба падвяргаецца воднай і ветравой эрозіі, асабліва церпяць тарфянікі — самы каштоўны зямельны рэсурс краіны.

Мінпрыроды зрабіла гэтую праблему пытаннем для дыскусіі з удзелам юрыстаў, дэпутатаў, землекарыстальнікаў і навукоўцаў, бо патрабуюцца змены на заканадаўчым узроўні.

Сімвалічным жэстам стала засяванне прадстаўнікамі Мінпрыроды, дэпутатамі і мясцовымі школьнікамі поля на тэрыторыі рэспубліканскага заказніка «Спораўскі».

Працэдура, вядомая як залуджванне земляў, ахоўвае глебу ад вымывання даждамі і выветрывання, бо травы фарміруюць шчыльны дзірван. Як адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Наталля ЖАРКІНА, «акцыя паказала, што кожны з нас не павінен чакаць нейкага выпадку, аднаўленне ўнікальных земляў — справа рук любога з нас».

Кацярына РАДЗЮК

■ Беражыце сябе!

У АГНІ ЗАГІНУЛА СЯМ'Я

Трагедыя адбылася ў магілёўскай вёсцы Вялікая Бароўка. Жанчына з дома насупраць першая ўбачыла пажар і патэлефанавала выратавальнікам. На жаль, да іх прыезду дах ужо абваліўся, пахаваўшы пад сабой 79-гадовую гаспадыню дома, а таксама яе сужыцеля, сына і дачку. Як паведаміла старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Магілёўскім абласным упраўленні МНС Вольга Нехарошых, сям'я характарызавалася станоўча. Прычыны трагедыі высвятляюцца. Дом не быў абсталяваны аўтаномным пажарным апавяшчальнікам.

Нэлі ЗІГУЛЯ

7 июля 2014 года в 14.00
состоится внеочередное общее собрание акционеров
ОАО «Черметремонт»,
место проведения собрания – по месту нахождения Общества: 223017, Минский р-н, п. Гатово, ОАО «Черметремонт», актовый зал.

Повестка дня:
1. О внесении изменений в устав.
2. О наблюдательном совете.
3. О завершении реализации инвестиционного проекта «Модернизация производства ОАО Черметремонт.
4. О сроках выплаты заработной платы.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 07.07.2014. **Место и время регистрации участников собрания –** в день проведения собрания с 13.00 до 14.00 по месту его проведения.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. При себе иметь документ, удостоверяющий личность и доверенность (для представителей).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник-пятница) с 8.30 до 17.00, начиная с 30.06.2014 в приемной ОАО «Черметремонт», а в день проведения собрания – с 13.00 до 14.00 по месту его проведения.

Дирекция
Наблюдательный совет
УНП 600068756

БАЛЬ ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ

1944-2014 70 гадоў вызвалення

Большасць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны альбо адзначыла дзевяностагадовы юбілей, альбо набліжаецца да гэтай даты. Таму першапачатковы клопат з боку дзяржавы — гэта забеспячэнне іх якаснай медыцынскай падтрымкай.

Як адзначыла начальнік аддзела першаснай медыцынска-санітарнай дапамогі камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Людміла ЛУГАВЕЦ, напярэдадні свят ужо завершаны поўны медыцынскі агляд усіх ветэранаў сталіцы. Цяпер распрацоўваецца план па рэабілітацыі для кожнага з іх. Адзін раз на тры гады заслужаныя людзі могуць прайсці курс па аздараўленні і рэабілітацыі ў цэнтры «Эрыус», а штогадова маюць права бясплатна паехаць у санаторый. Арганізаваны кабінеты паліятыўнай дапамогі, дзе сваякоў вучаць правільнаму догляду цяжкахворых людзей, працуюць два хоспісы. Акрамя таго, праводзяцца заняткі па медыцынскай дапамозе ў школах трэцяга ўзросту.

Штомесячна ветэраны атрымліваюць сацыяльную дапамогу ў памеры 303 тысяч рублёў. Уведзены грашовыя кампенсацыі на рамонт жылля — каля 6 мільёнаў рублёў на год. Дарэчы, з 1666 просьбаў ад ветэранаў, якія атрымалі ў Мінгарвыканкаме ў першым паўгоддзі, незадаволенымі засталіся толькі 8. Матэрыяльная забяспечанасць ёсць, аднак самі ветэраны часта скардзяцца на дэфіцыт чалавечых стасункаў, бо многія з іх адмежаваны ад свету сценамі ўласнай кватэры.

Праблему сацыялізацыі ветэранаў у Мінгарвыканкаме вырашаюць даволі актыўна: за пажылымі людзьмі замацоўваюць сацыяльных работнікаў, якія перыядычна наведваюць іх, штодня размаўляюць па тэлефоне. Працуе з ветэранамі і моладзь.

«Сёння рэалізуецца праект «Пажылыя — старым»,— распавяла намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА.— Ветэраны працы добраахвотна шэфствуюць над ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны: заходзяць у госці, чытаюць разам кніжкі, купляюць прадукты ў краме, арганізуюць вячоркі і маленькія святы». Сярод апошніх новаўвядзенняў варта адзначыць «ветэранскія дворыкі» — пляцоўкі для адпачынку, якія ствараюцца сіламі супрацоўнікаў ЖЭСаў і мясцовых жыхароў. Ужо налічваецца пяць такіх месцаў у Ленінскім, Партызанскім, Першамайскім, Савецкім і Цэнтральным раёнах.

А сёння ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» а 16 гадзіне пачнецца «Ветэранскі баль», прысвечаны святкаванню 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У мерапрыемстве прымуць удзел ветэраны, людзі, што пацярпелі ад наступстваў вайны, а таксама члены Маскоўскага гарадскога савета ветэранаў. «Беларускіх ветэранаў будзе каля 500 чалавек,— адзначыла Ірына Дудка.— Яны атрымалі бясплатныя цырульніцкія і бытавыя паслугі, прайшлі медыцынскі агляд, таму да мерапрыемства падрыхтаваны добра».

Кацярына РАДЗЮК

Школьнікі перажывуць ноч вайны

Сумесны праект дзіцячай творчасці «Дзеці за мір!» напярэдадні памятнай даты пачатку Вялікай Айчыннай вайны праводзяць Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства нацыянальнай бяспекі Азербайджанскай Рэспублікі і Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У пятніцу адбудзецца конкурс-выстава дзіцячых тэматычных малюнкаў, канцэрт з удзелам беларускіх дзіцячых танцавальных і спеўных калектываў, дэманстрацыя калекцый студыі дзіцячай моды ад азербайджанскіх гасцей. А ў ноч з 21 на 22 чэрвеня беларускія і азербайджанскія школьнікі стануць сведкамі рэстаўраваных падзей пачатку Вялікай Айчыннай у Брэсцкай крэпасці.

Ведамствы, якія адказваюць за дзяржаўную бяспеку ў Азербайджане і Беларусі, прымаюць пасільны ўдзел у выхаванні моладзі сваіх краін дзеля ўмацавання патрыятызму і талерантнасці, адзначаюць у прэс-службе КДБ Беларусі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Камунальныя стасункі

ПАЦЯРПЕЦЬ ЛЕТАМ, КАБ НЕ ПАКУТАВАЦЬ ЗІМОЙ

ЗА СЕЗОН АДКЛЮЧЭННЯ ВАДЫ ЗАМЕНЯЦЬ БОЛЬШ ЗА 600 КМ ЦЕПЛАСЕТАК

Агульныя затраты арганізацый ЖКГ на падрыхтоўку да ацяпляльнага сезона складаюць каля 2,6 трыльёна рублёў. З іх прыкладна 55% — сродкі мясцовага бюджэту, 36% — сродкі арганізацый ЖКГ, астатнія 9% — іншыя крыніцы фінансавання, паведаміў журналістам намеснік міністра ЖКГ Анатоль ШАГУН.

На падрыхтоўку краіны да зімы адводзіцца 5 месяцаў, аб'ёмы работ штогод прыкладна аднолькавыя: наладзіць цепласеткі, упарадкаваць жыллёвы фонд, нарыхтаваць паліва. На пачатак чэрвеня падрыхтоўчыя работы (выпрабаванні абсталявання кацельняў, цепласетак) ужо былі выкананы на 40–45%, рамонтна-прафілактычныя работы — на 20%. Паспелі адрамантаваць 976 кацельняў (27%), 348 цэнтральных цеплавых пунктаў (20%), ачысцілі 36% паверхняў катлоў, 29% водаграваль-нікаў і бойлераў.

Вялікая ўвага ў сістэме ЖКГ надаецца пытанням замены цепласетак. У першую дэкаду чэрвеня паспелі замяніць 153 кіламетры цепласетак па краіне з 634 — гэта 24% ад плана.

Паступова папаўняюцца запасы паліва. Мазут у сістэме ЖКГ ужо амаль не выкарыстоўваецца і з'яўляецца рэзервным палівам на выпадак надзвычайных сітуацый. Яго запас складае 16,4 т. Асноўныя ж віды мясцовага паліва, якія выкарыстоўваюцца ў сістэме ЖКГ — драўніна (яе ўжо нарыхтавана 1,8 млн шчыльных кубоў) і прыродны газ.

Па водаправодных работах — рамонце свідравін, водаправодных сетак, помпавых станцый — выкана ўжо каля 25%. Падрыхтоўкай да перыяду ацяплення выклікана і штогадовае адключэнне гарачай вады летам. — Да ацяпляльнага сезона водаканалізацыйная гаспадарка будзе падрыхтавана своечасова, большасць работ будзе выканана нават да першага верасня,— паабяцаў Анатоль Шагун.

Адна з асноўных задач ЖКГ напярэдадні зімовага перыяду — падрыхтоўка жыллёвага фонду. Пераважныя аб'ёмы работ тут складаюць рамонт дахаў і стыкаў сценавых панэляў. — Ва ўсіх арганізацыях ЖКГ работа вядзецца ў планавым парадку. Мы разлічваем, што да першага кастрычніка наша галіна ўступіць у асенне-зімовы перыяд без збояў,— падсумаваў спікер.

Падчас сустрэчы з журналістамі Анатоль Шагун агучыў прапановы, унесеныя ў праект указа, падрыхтаванага па выніках працы рабочай групы, створанай сёлета ў лютым для вырашэння праблемных пытанняў у сістэме ЖКГ. Так, плануецца стварыць жыллёвую інспекцыю для арганізацыі кантролю за станам жыллёвага фонду. Апроч таго, разглядаецца ўнясенне змен у сістэму кіравання галіной. Цяпер яе палітыку фарміруе Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, але фінансава-гаспадарчую дзейнасць ажыццяўляюць адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Таму ўзнікла прапанова выйсці на адзіную па ўсіх абласцях сістэму кіравання ЖКГ. Прапановы рабочай групы прывядуць да зніжэння сабекошту жыллёва-камунальных паслуг.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ АПК: на кантролі

А ЗЯМЛЮ МОГУЦЬ І АДАБРАЦЬ

За ўчастак, дзе замест вырошчвання сельскагаспадарчай прадукцыі і лясоў будзе весціся будаўніцтва, трэба пералічваць грошы ў бюджэт.

Тых, хто гэтага не робіць, могуць пакараць даволі жорстка. У прыватнасці, адабраць тую зямлю. А ў выпадку невызвалення зямельнага ўчастка (пасля спынення права карыстання.— **Аўт.**) прадугледжаны штрафы: на грамадзяніна — да 4,5 млн рублёў, на індывідуальнага прадпрымальніка — да 15 млн, а на юрыдычную асобу — да 45 млн рублёў. У некаторых выпадках парушэнні могуць стаць падставай для завядзення крымінальнай справы.

На Віцебшчыне толькі пасля патрабавання Камітэта дзяржаўнага кантролю ў якасці пакрыцця страт сельскагаспадарчай і лесагаспадарчай вытворчасці ў бюджэт пералічылі больш за 2 млрд рублёў.

— Землекарыстальнікі абавязаны кампенсаваць адпаведныя страты. Кантролем за выкарыстаннем і аховай зямель павінны займацца мясцовыя органы ўлады. У выніку праверак былі выяўлены парушэнні заканадаўства. Напрыклад, на пачатак гэтага года мелі пратэрмінаваную запазычанасць — амаль 4,5 млрд рублёў — землекарыстальнікі Віцебскага, Дубровенскага, Сенненскага, Талачынскага, Аршанскага і Шумілінскага раёнаў, а таксама Віцебска,— растлумачыў карэспандэнту «Звязды» Вадзім Валовіч, намеснік начальніка ўпраўлення камітэта.

Пры гэтым некаторыя чыноўнікі толькі адпраўлялі землекарыстальнікам лісты з просьбай прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць пакрыццё страт. Што дзіўна, некаторыя работнікі райвыканкамаў чамусьці лічаць, што кантроль за паступленнем у бюджэт названых сродкаў не ўваходзіць у іх абавязкі.

— Напрыклад, у Віцебскім раёне на пачатак праверкі (сёлета ў сакавіку.— **Аўт.**) землекарыстальнікі своечасова не пералічылі ў бюджэт 2,1 млрд рублёў. Пры гэтым у райвыканкаме не спяшаліся нешта рабіць, каб грошы пералічвалі. Сваё бяздзеянне рэвізорам патлумачылі тым, што гэтую работу праводзіць землеўпарадкавальная служба Віцебскага аблвыканкама,— працягвае Вадзім Валовіч.

Аналагічныя парушэнні нядаўна выявілі і ў Аршанскім раёне.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Вакол футбола

ЯК ДОН ФАБІА ЛАТАЕ ДЗІРКІ

У свой дзень нараджэння галоўны трэнер зборнай Расіі Фабіа Капэла застаўся без падарунка. У дэбютным матчы на мундыялі яго падапечныя ледзь пазбеглі паражэння ад Паўднёвай Карэі.

У сярэдзіне другога тайма хуткія і вёрткія азіяты забілі першы гол. Ды яшчэ які! Здавалася, прамалінейны прастрэл Лі Хо стане лёгкай здабычай для вопытнага Ігара Акінфеева. Але мяч фактычна ад рук расійскага галкіпера па-здрадніцку праскочыў у вароты. Ужо пасля матча Капэла спакойна скажа, што любы футбаліст мае права на памылку, але падчас гульні дон Фабіа не знаходзіў сабе месца. Італьянцу, бадай, дастаўся найменш крэатыўны падбор гульцоў за ўсю гісторыю зборнай. А адсутнасць Рамана Шырокава ў камандзе толькі выявіла каласальныя праблемы расіян у нападзенні. І калі б не выратавальны гол Аляксандра Кержакова, які зраўняў лік і прынёс сваёй зборнай першае ачко на турніры, шанцы бронзавых прызёраў чэмпіянату Еўропы 2008 года на выхад з групы выглядалі б зусім блякла.

Дарэчы, пасля матча галоўны трэнер паўднёвых карэйцаў Хон Мён Бо адзначыў, што быў упэўнены ў майстэрстве свайго паўабаронцы, які, між іншым, выйшаў на замену: «Планаваў выпусціць Лі Хо, бо цэнтральныя абаронцы Расіі даволі марудныя, і я ведаў, што ў другім тайме яны стомяцца». Цікава, як расіяне збіраюцца змагацца з не менш хуткай зборнай Бельгіі — ценявымі фаварытамі мундыялю? Ды і прабіць шчыльную абарону алжырцаў у адсутнасць яркіх форвардаў, здаецца, будзе зусім няпроста.



Гол Кержакова выратаваў зборную Расіі ад балючага паражэння.

Фабіа Капэла зараз не крытыкуе толькі лянівы. Маўляў, зорны трэнер з вялікай зарплатай — для Расіі не гарантыя поспеху. Яшчэ і прывівае камандзе непрыгожы футбол — абаронны, прагматычны. Калісьці грэкі сталі чэмпіёнамі Еўропы з падобнай гульнёй. Але героямі Старога Свету эліны так і не сталі. Цяпер заўзятары зборнай Расіі чамусьці баяцца, што іх улюбёнцы саб'юцца на «грэчаскі шлях». Зрэшты, гол Кержакова, выкананы ў выдатным стылі, быццам нагадвае скептыкам: атакаваць расіяне не развучыліся. У той жа час, як паказаў матч з азіятамі, у абароне хапае дзірак. Дык, мабыць, няхай дон Фабіа іх і латае?

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

ПРАГНОЗ

Уладзімір СТАГНІЕНКА, расійскі спартыўны каментатар.

— У тое, што зборная выйдзе ў плэй-оф, я веру. Мне здаецца, на гэта майстэрства Капэлы хопіць. А вось прасунуцца далей наўрад ці атрымаецца. Гуляць на роўных з «грандамі» нашай зборнай пакуль не па сілах. Хоць маленькая, але вельмі смелая Боснія ўжо прадэманстравала на мундыялі характар, выдатна пазмагаўшыся з Аргенцінай. Чаму б Расіі не паказаць падобны ўзровень?

Мікалай ХАДАСЕВІЧ, вядучы тэлепраграмы «Час футбола» на тэлеканале «Беларусь 5», спартыўны каментатар.

— Для расіян максімум на чэмпіянаце — 1/8 фіналу. Але, шчыра кажучы, не думаю, што яны ўвогуле выйдуць з групы. У маім разуменні, зборная Расіі — гэта каманда, якая сама сабе шкодзіць. Часам здаецца, што ім элементарна не хапае сабранасці і настрою. Ці зможа Капэла мабілізаваць сваю дружыну? Не ведаю… Трэба цвяроза ацэньваць рэзерв, а ён у расіян слабы. Усё ж такі страта Шырокава сур'ёзна паўплывала на канкурэнтаздольнасць каманды. Перабудаваць увесь цэнтр поля, знайсці новыя варыянты для атакі будзе вельмі складана.

■ Шляхамі пісьменніка

Да Быкава ў Бычкі

Напярэдадні 90-й гадавіны з дня нараджэння пісьменніка карэспандэнт «Звязды» пабываў на яго малой радзіме

Сваякі знакамітага на ўвесь свет пісьменніка расказалі, што Васіль Уладзіміравіч быў вельмі добрым чалавекам, маўклівым, не сквапным і зусім не «зорным». І гэта пры тым, нагадаю, што ён быў лаўрэатам дзяржаўных прэмій СССР і БССР, Героем Сацыялістычнай Працы, народным пісьменнікам Беларусі...

«БЫКАЎ АДВЁЗ МЯНЕ ПА НЯВЕСТУ»

Каля сядзібы-музея В.У. Быкава ў вёсцы Бычкі пазнаёміўся з Мікалаем Мікалаевічам Харакам. Ён жыве ў суседнім аграгарадку Кублічы, даглядае музей, наводзіць парадак на падворку, адчыняе дзверы, калі прывозяць экскурсантаў. А раней працаваў вадзіцелем у гаспадарцы.

— Ці былі вы знаёмы з Быкавым? — пытаю я мужчыну.

— Я — яго пляменнік. Мой тата — родны брат Быкава. Цяпер мне 55 гадоў. З дзяцінства яго добра памятаю. Прыязджаў дзядзька Вася заўсёды з гасцінцамі. Аднойчы «Кока-колу» мне прывёз — тады гэтага напою ў нас не прадавалі. Во шчасце было! — расказвае ён.

Паводле слоў Мікалая Мікалаевіча, Васіль Быкаў быў вельмі сціплым чалавекам, маўклівым. Прыедзе, запытае: маўляў, ці жывыя ўсе, як здароўе, як гаспадарка? Шмат пра свае справы не расказваў.

— Ён да нас штогод прыязджаў, бывала, і не раз. І я ў яго гасціў: у Гродне, Мінску, — працягвае Мікалай Харак.

Васіль Уладзіміравіч, нягледзячы на занятасць, заўсёды знаходзіў час, каб наведаць родных. Напрыклад, калі пляменнік служыў пад Мінскам у арміі, некалькі разоў прыязджаў да яго. А пасля дэмабілізацыі дапамог касцюм купіць. Захаваліся лісты Быкава сваякам. Два лісты Мікалай Мікалаевіч у дзень нашай размовы перадаў у дар музею.

— Менавіта дзядзька ў дзень майго вяселля адвёз мяне на сваёй «Волзе» ў вёску па нявесту, — працягвае суразмоўца. Нядаўна тую машыну купіў. А раней у яго «Жыгулі» былі. Канешне, у той час каб жаніха прывезлі на такім шыкоўным аўто, ды яшчэ за рулём быў такі чалавек — гэта было вельмі прэстыжна. Ён быў добрым вадзіцелем і не давяраў нікому садзіцца за руль. Калі прыязджаў да нас, любіў на рыбу хадзіць. Мы тое возера цяпер так і называем — «Быкаўскае».

Мікалай ХАРАК каля партрэта свайго дзядзькі.

Разам зайшлі ў дом Быкава, спыніліся каля партрэта Васіля Уладзіміравіча. Я заўважыў, што пляменнік, якога я спецыяльна папрасіў стаць побач, каб зрабіць ягоны здымак, вельмі падобны на пісьменніка. Мікалай Мікалаевіч прызнаўся, што літаратурны дар яму не перадаўся, як і іншым сваякам Быкава. Але характар у пляменніка, як мне падалося, як і ў яго знакамітага дзядзькі: ён такі ж спакойны, ветлівы, не гаварлівы...

ДОМ ПЛОШЧАЙ 42 КВ.М

Наталля Марковіч, намеснік старшыні Ушацкага райвыканкама расказала пра музей Быкава. Будынак плошчай усяго 42 кв.м — дакладная копія дома Быкава. Музей адкрыўся тут 10 гадоў таму. Ён унікальны тым, што працуе толькі тады, калі нехта прыязджае ў Бычкі, каб пабываць у доме Майстра слова. Турыстаў суправаджае экскурсавод з раённага музея.

Менавіта дзядзька ў дзень майго вяселля адвёз мяне на сваёй «Волзе» ў вёску па нявесту. У той час каб жаніха прывезлі на такім шыкоўным аўто, ды яшчэ за рулём быў такі чалавек — гэта было вельмі прэстыжна.

— Сапраўдны дом, у якім жыў будучы пісьменнік разам з бацькамі, сястрой і братам, пабудавалі яшчэ ў пачатку 1930-х гадоў. Зразумела, што такі стары будынак з часам разбураўся: праваліліся столь і падлога, у дрэнным стане была печ. Цяперашні дом — дакладная копія. Але ўнутры — адноўлены інтэр'ер, сярод экспанатаў — прадметы, якія належалі сям'і Быкава. У экспазіцыі — дакументы, фотаздымкі, кнігі з аўтографамі вядомых людзей, кнігі і часопісы з творамі Быкава, копіі малюнкаў і асабістыя рэчы пісьменніка. Жыхары вёскі Бычкі з задавальненнем прыносілі ў музей рэчы мінулых гадоў, — расказала яна.

На тэрыторыі падворка — хлеў, гумно, дрэвы, якія пасадзіў бацька Быкава.

Нядаўна быў праведзены абласны мастацкі пленэр імя В.У. Быкава, прысвечаны 70-й гадавіне вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У ліпені будзе арганізавана выстава твораў — у раённым музеі народнай славы. Мастакі паабяцалі па адной рабоце падарыць.

«ЁН ПА НАЧАХ ПІСАЦЬ ЛЮБІЎ»

У вёсцы Бычкі цяпер жывуць менш за дваццаць чалавек — усе пенсіянеры. Два разы ў тыдзень прыязджае аўталаўка, па выкліку — хуткая дапамога. Тутэйшыя жыхары на жыццё не скардзяцца. Ганарацца, што яны землякі Быкава! Жыве ў Бычках і 76-гадовая Антаніна Аляксандраўна — мама Мікалая Мікалаевіча. Цікава, што ў яе доме калісьці з вясковай дзятвой займаўся настаўнік. Такім чынам, можна сказаць, што жыве бабуля Антаніна таксама ў вельмі знакавым месцы, звязаным з Быкавым.

— Я раней у іншай вёсцы жыла. Вядома, хвалявалася перад знаёмствам з Васілём Быкавым. Я жонкай яго малодшага брата была. Муж мой памёр. Памятаю, прыехаў Васіль, а страху я нацярпелася! Як весці сябе падчас стасункаў з такім чалавекам? А ён, я адразу пачула, быў вельмі простым чалавекам. Пацікавіўся: адкуль я, чым займаюся? Ну, мне і спакойна адразу стала. Я і да яго ў госці ездзіла. Памятаю, у Мінску гасціла. Ноч на дварэ, гляджу, а ў яго ў кабінеце святло ўсё гарыць і гарыць. А я на новым месцы не магу спаць. Ноч не спала і ўсё слухала. Ірына, жонка яго таксама не спала. Ён, можа, гадзіны ў тры толькі выключыў святло. Ірына пасля мне патлумачыла: «А ў нас так: ноч сядзім, днём спім. Не тое, што ў вас — у вёсцы, калі ўставаць вельмі рана трэба». А ён жа хворы быў — астматык, нават на падушцы не спаў, — дзеліцца ўспамінамі жанчына.

Антаніна Аляксандраўна працавала на будоўлі, у гандлі. Сказала, што пісьменнік дапамог купіць дом, у якім мы размаўлялі.

— Як гэтую хату куплялі, ён даў 500 рублёў — вялікія грошы на той час. Такі ён быў — не сквапны. Я назбірала грошай, каб доўг аддаць, але ён не ўзяў. Сказаў, «хай будзе мой уклад». Мо яшчэ і таму, што ён жа хадзіў у гэтай хаце ў 1 клас. Тады, памятаю, калі гэтую хату купілі, ён прыехаў. І гляджу, што ён ходзіць па хаце. І кажа: «Во, мая парта тут стаяла».

Заўсёды з падарункамі прыязджаў, бо ведаў, што ў вёсцы, акрамя малака і сала, няма нічога, — расказвае бабуля.

Антаніна Аляксандраўна прызналася, што, калі быў добры зрок, любіла чытаць творы Быкава — «Альпійскую баладу», «Мёртвым не баліць»...

— Коля мой, калі быў маленькім, памятаю, робіць урокі, а пад кніжкамі — дзядзькавы апавяданні, — працягвае сваячка пісьменніка.

Яна з болем успамінала пасляваенныя гады, калі ледзь не памерла ад голаду. І сям'я Быкавых галадала. Нягледзячы на дрэннае здароўе, і цяпер працуе на вялікім агародзе.

— Жыць у вёсцы можна. Шкада, здароўя няма. У вёсцы ж трэба працаваць. Парасяты і куры ёсць, карову ўжо не трымаю — сілы няма, рукі баляць. А агарод вялікі — сотак 30. Бульбу патроху садзім, цыбулю, — расказвае пра гаспадарскія клопаты бабуля.

Сказала, што да Быкава ў Бычкі часта прыязджаюць і іншаземцы. Напрыклад, прыязджалі французы на роварах. Таксама пыталіся: якім быў Быкаў?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.
Ушацкі раён — Віцебск

■ Падзея

СКАРЫНА ПАЙШОЎ У ЛЮДЗІ

ПРЭЗЕНТАВАНА 5 ФАКСІМІЛЬНЫХ ВЫДАННЯЎ КНІГ БІБЛІІ НАШАГА ПЕРШАДРУКАРА

У 2013 годзе быў распачаты праект па перавыданні кніжнай спадчыны Францыска Скарыны. Зусім нядаўна «Звязда» пісала пра падпісанне ў друк першага тома, пра яго выданне, а сёння мы можам бачыць ужо 5 кніг Скарыны. Плануецца, што да 2017 года — 500-годдзя айчыннага кнігадрукавання — усе 20 кніг Скарыны зноў убачаць свет у факсімільным выданні.

Учора ў Нацыянальнай бібліятэцы адбылася ўрачыстая прэзентацыя перавыдадзеных кніг Бібліі. На ёй прысутнічалі прадстаўнікі дыпламатычных місій тых краін, якія пэўным чынам былі звязаны з нашым першадрукаром, — Германіі, Італіі, Польшчы, Расіі, Украіны і Чэхіі. Усе яны атрымалі ў дар каштоўныя выданні. Прадстаўнікі раённых бібліятэк Мінскай вобласці таксама вернуцца ў свае ўстановы з гэтымі кніжнымі падарункамі.

Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ і дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман МАТУЛЬСКІ.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ, які ўдзельнічаў ва ўрачыстасці, адзначыў:

— Пакуль пачыналася гэтая імпрэза, у мяне з'явілася думка, што той, хто першым дайшоў да стварэння кнігі, такой найвялікшай каштоўнасці ўсяго чалавецтва, пэўна, вельмі хацеў адысці ад тлуму гэтага жыцця, ад віру падзей і імкнуўся да цішыні, каб мець магчымасць застацца сам-насам з кнігай. Я вельмі рады, што мы ладзім гэты кніжны праект, бо ён яшчэ раз падкрэслівае, што Скарына быў чалавекам не толькі беларускай культуры, але і ўсёй еўрапейскай, які зрабіў у яе вялікі ўнёсак. Ён быў тым, хто ў сярэднявечным свеце падарыў многім народам хрысціянскую кнігу.

Адзіны арыгінальны збор выданняў Скарыны ў нашай краіне сёння захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы. Яе **дырэктар Раман МАТУЛЬСКІ** заўважыў:

— Гэтым праектам мы спрабуем вярнуць свету тую спадчыну, якая была назапашана ў свой час, і паспрабаваць узнавіць эпоху Францыска Скарыны. Тады ён рабіў амаль неверагоднае: кнігі, на вытворчасць якіх патрэбен быў год, а то і дзесяцігоддзе, пачалі з'яўляцца за некалькі тыдняў; кнігі, на якія неабходна было патраціць цэлыя маёнткі, сталі каштаваць, дзякуючы накладам, нашмат танней; кнігі, да якіх раней маглі дакранацца толькі святары, сталі даступнымі шырокаму колу чытачоў. Скарына перавёў кнігі з катэгорыі выключна царкоўнага ўжытку ў «энцыклапедыю чалавека», як ён сам піша ва ўступным слове да Бібліі, той падручнік, па якім маглі вучыцца многія. Гэта сведчыць і пра высокі ўзровень грамадства, якое магло ўспрыняць такія выданні, бо кнігі сапраўды пайшлі ў людзі…

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Далучайцеся!

КНІГА ПАДАРОЖНІЧАЕ ПА РОЗНЫХ АДРАСАХ

Сёння Узда і Уздзенскі раён сустракаюць акцыю Міністэрства інфармацыі, Мінскага аблвыканкама, Саюза пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкага дома «Звязда» «Лета з добрай кнігай». У раённым палацы культуры бібліятэкары, настаўнікі і юныя чытачы наладзілі святочную імпрэзу. А дапамаглі ім у гэтым і Уздзенскі райвыканкам, і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіслаў Цыдзік. Знайшліся і спонсары сапраўды творчага праекта, якія набылі для бібліятэк Уздзеншчыны каля 300 дзіцячых кніг. Салаўіным краем называюць мясціны, якія выпеставалі Кандрата Крапіву, Паўлюка Труса, Антона Бялевіча, Пятра Глебку, Лідзію Арабей, Васіля Шырко і іншых рупліўцаў на ніве мастацкага слова. Безумоўна ж, арганізоўваючы акцыю, скіраваную на пашырэнне чытацкай прасторы, развіццё ўвагі да друкаванай кнігі, і ў Міністэрстве інфармацыі, і ў СПБ, і ў выдавецтвах краіны спадзяюцца на тое, што галоўнымі завадатарамі гэтай справы выступяць найперш пісьменнікі — тыя, хто сёння стварае новыя кнігі.

Мікола БЕРЛЕЖ

АБУДЗІЦЬ ЖЫВЫХ — ДА ЖЫЦЦЯ

Баліць... Калі можна было б вызначыць адным словам галоўны матыў творчасці Васіля Быкава, то яно б характарызавала б моцнае пачуццё неабыякавага чалавека, які хацеў бы абудзіць іншых да жыцця. Абудзіць іншых — жывых — да жыцця, якое пачало сыходзіць у звыкласць, у будзённасць, у стабільнасць і прадвызначанасць, за якімі губляецца часта чалавек як асоба. Мы можам існаваць па завядзёнцы, думаць пра свае жаданні і планы. Ставіць іх вышэй за планы і жаданні іншых. Пакуль не надыдзе момант, калі мы разумеем: той, іншы, чужы чалавек мае каштоўнасць у маім жыцці, можа ўплываць на яго нават тады, калі мы не знаёмыя. І каштоўнасць майго жыцця вымяраецца каштоўнасцю яго жыцця. Бо ў нашым свеце кожны чалавек — частка адзінай сістэмы ЗЯМНОГА ЖЫВОГА, у якой страта асобнай часцінкі прыводзіць да парушэння балансу. І сістэма можа разбурацца, а гэта ўдарыць і па частках іншых. Так ці інакш.

У творах Быкава расповед ідзе заўсёды пра часткі, роля якіх вызначальная для Жыцця. Людзі як часцінкі жывога ў канкрэтных сітуацыях, самых экстрэмальных умовах, якія толькі могуць быць. Няма нічога больш жудаснага і вар'яцкага, калі людзі — істоты аднолькавыя па сутнасці эмоцый, адчуванняў, жаданняў — пачынаюць знішчаць сабе падобных. І знішчэнне становіцца прагай для некаторых. У той час тыя, хто з адваротнага боку выбіраюць: падпарадкоўвацца гэтай празе ці змагацца за сябе. І за тых сабе падобных, жыццё каго можа залежаць ад твайго выбару. Быкаў сам зведаў гэты момант асабістага выбару, калі на фронце штодня назіраў моманты гераізму (калі выбар жыцця іншага быў вышэйшы за жаданне жыцця асабістага), і ён, пабываўшы ў тых умовах выбару, разумеў сутнасць слабасцяў клопату за сваё выжыванне. Менавіта выжыванне — бо калі ахвяруеш іншымі, жыццё можа быць толькі часовым: сёння, заўтра — і забылі. Ці захацелі забыць, выкрасліць імя той часцінкі, якая аказалася слабой. Гэта цуд Быкава як пісьменніка: ён пісаў пра вайну, але вывеў генеральную формулу чалавечых паводзін у любых сітуацыях, калі, кіруючыся маральным законам асобны чалавек становіцца АСОБАЙ. І тады часцінка вызначае існаванне народа, краіны і нават, можа быць, усёй чалавечай цывілізацыі. Яму балела. Ён здолеў данесці гэты боль, нараджаючы адказнасць. І таму — баліць. І сёння баліць, калі чалавек ізноў на мяжы выбару: жыць за сябе ці жыць дзеля іншых. Баліць... Гэтым вялікі наш пісьменнік з яго вечным болем. Такім адчувальным і зразумелым — на ўсе часы, пакуль ёсць чалавек, з усімі спакусамі, якія на яго звальваюцца. Вайна можа быць і нябачнай...

Сёння, у дзень народзінаў Васіля Уладзіміравіча, у дзень 90-гадовага юбілею пісьменніка, хочацца звярнуцца да яго як да асобы, дзеля таго, каб лепш разумець сябе.

«ПАЙСЦІ — І ВЯРНУЦЦА»

Сяргей ПАНІЗНІК, паэт:

— Уяўляючы Мацярык Васіля Быкава, я напісаў такія радкі: «О, выспа шчасця —Атлантыда: / каму амбон, каму — карыта... / Тарнада зможа тут прайсці. / Але атланта-беларуса / не змые хваля землятруса: / яго — назло! — ўтрымаць павінна / жывога слова пупавіна».

Васіль Быкаў. Гродна, Замкавая гара. Чэрвень 1969 г. Фота С. Панізніка.

Першы раз сустрэўся з Васілём Уладзіміравічам каля Каложы тым чэрвенем, калі жыхару Гродна споўнілася 45 гадоў. Напружаныя былі часіны для пісьменніка-франтавіка, які не ўтойваў ад чытача жорсткую праўду вайны. Перажываў, бо хмары часта завісалі над выпакутаванымі аповесцямі. Але ў маім першым вершы-прысвячэнні В. Быкаву нібыта яго вуснамі вымавіліся такія аптымістычныя радкі: «Чую, чую: у звыклай буднасці / трапяткое крыло... І верыцца: / не заснула ты, чуйнае сэрца, / да прылётнай абуднасці. / Пад завеяй не затыхнулася, / не знямела яшчэ — і можа / тою гулкаю быць Каложай, / што над Нёманам пахіснулася».

Васіль Быкаў, як ніхто іншы з нашых літаратараў, стаў самым гулкім на кантынентах планеты, куды разам з яго творамі «перакладалася» Беларусь і найменне таго народа, які, паводле разважанняў В. Быкава, мужна, балюча ўсё яшчэ стварае ў сябе нацыю.

Дзяржаватворцам быў Быкаў у с в а е 45 гадоў. Такім ён застаецца і цяпер, у яго і ўжо ў н а ш а 90-годдзе, калі мы ў дзень юбілею згадваем і Героя (Літаратурнай!) Працы, і Народнага (а таксама — міжнароднага) пісьменніка.

Васіль Быкаў «дажыў да світання» сваёй высакароднай ідэі — Словам служыць Праўдзе. Цяпер яго «доўгую дарогу дадому» прадаўжаць нам — богакроплям у бласлаўлёным ім акіяне жыцця. Калісьці, нібыта ад імя Быкава, складаліся такія радкі з прысвечанага яму верша: «Мая світальная істота — /асоба гордая, жывая... / Яна для Госпада — гаспода / малітвенная, крыжавая». То няхай і сёння бадзёрыцца для новых узлётаў пранізлівая душа Васіля Уладзіміравіча. А светлая памяць пра атланта асмельвае нас на ўгаспадарлівасць яго айчыннага Мацерыка.

«ХРЫБТОМ, СКУРАЙ ВАЙНУ АДЧУЎ»

Міхась ТЫЧЫНА, літаратуразнаўца, пісьменнік, доктар філалагічных навук:

— Кожны таленавіты чалавек важны для культуры краіны, а тым больш чалавек, у дачыненні да якога ўжо гучыць паняцце «геній» — абгрунтавана і невыпадкова, бо ўсё жыццё яго пацвярджае гэты яго грамадскі статус. На маю думку, Васіль Быкаў уяўляе сабой разгорнутую хартыю (ёсць такі вобраз у гістарычнай літаратуры, гэта тое, на чым пішуць нейкія значныя рэчы), якая напісана гісторыяй XX стагоддзя, і Васіль Быкаў у гэтай гісторыі заняў асобнае месца. Бо цяжка ўявіць без яго Рэспубліку Беларусь. Яна была б іншай без Быкава, калі б у ёй не было такога тонкага і выдатнага летапісца ваенных часоў і тых падзей, якія адбываліся на працягу XX стагоддзя. Гэта сведчанне і яго маштабу.

— Калі вызначаць месца беларускай літаратуры ў сусветнай, то мы часта вельмі сціплыя, можа, таму што недастаткова ўсведамляем такую з'яву, як Быкаў, які не падобны ні на каго...

— Калі гаварыць пра сусветны ўзровень, то трэба меркаваць па нейкіх дакладных звестках. Я, будучы ў Германіі гадоў 10 таму, заходзіў у кніжныя крамы і заўсёды цікавіўся, ці ёсць там кнігі Быкава. Калі трапляла энцыклапедыя, то хацелася зазірнуць, ці ёсць Быкаў. Вядома, напрыклад, што нашы класікі Янка Купала і Якуб Колас прысутнічаюць і ў брытанскай энцыклапедыі. Прынамсі, у нямецкай, на нямецкай мове я якраз бачыў імя Васіля Быкава і быў вельмі ўзрадаваны. Вядома, трэба лічыцца і з такімі фактамі, што яго творы выходзілі амаль на 50 самых вядомых мовах свету ў перакладзе. Я ведаю, што нават студэнты некаторых універсітэтаў у Амерыцы цікавяцца яго вядомай аповесцю «Мёртвым не баліць». Баліць жывым і баліць людзям, якія ў тым ліку за мяжой жывуць — у іх жа ёсць пачуцці. Я думаю, яны таксама шукаюць адказаў на жыццёвыя пытанні. Насамрэч цяжка вызначыць, колькі дакладна людзей прачыталі, асэнсавалі, адчулі думкі пісьменніка, нават у нас.

— У творах Васіля Быкава — беларускае адчуванне вайны. Ці можна гаварыць пра адметнасць беларускай ваеннай прозы?

— Гэтая адметнасць ідзе ад той адметнасці, якой была вайна на нашай тэрыторыі, бо раней такога свет не ведаў. А цяпер імкнецца ведаць. Таму і сведчанняў розных у нас багата. Узгадаць можна яшчэ дакументальную кнігу «Я з вогненнай вёскі». Вядома, тая вайна была не параўнальная з ніякімі папярэднімі войнамі. Быкаў гэта не проста ведаў, а хрыбтом, скурай вайну адчуў, нёс гэтыя веды да канца.

«СТАЦЬ ЧАЛАВЕКАМ З ВЯЛІКАЙ ЛІТАРЫ»

Сяргей МІНСКЕВІЧ, літаратар, кандыдат філалагічных навук, супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі:

— Васіль Быкаў найперш цікавы тым, што ён пісаў праўду. Пісаў тое, што ён перажыў сам, таму ведаў і хацеў зрабіць псіхалагічны аналіз сваіх герояў: што яны перажылі, дзе мяжа чалавечнасці, а дзе — нечалавечнасці. Таму што ён пісаў пра вайну, дзе людзі былі ў нечалавечых умовах. Гэтыя ўмовы на іх зваліліся — ніхто сам такога не шукаў. І вось ён разважаў, як чалавек можа ці выжываць, ці загінуць у такіх умовах. Таму Быкаў — фактычна даследчык душы чалавека. І гэтым ён цікавы не толькі для Беларусі, а для ўсяго свету, бо выказаў у творах досвед, які меў сам. Досвед — як папярэджанне іншым, як глыбокае веданне таго, што можа адбывацца з чалавекам.

— У савецкі час, калі было больш жывых сведкаў вайны, кнігі Быкава былі вельмі запатрабаваны. Сучаснае маладое пакаленне выхоўваецца ў іншых умовах. Але наколькі цікавыя яму такія кнігі?

— Цяперашняй моладзі вельмі цяжка чытаць сур'ёзныя кнігі, таму што ў яе вельмі мала часу: цяпер з'явіліся інтэрнэт, усе хочуць чытаць тое, што выкладзена ў сацыяльных сетках сябрамі ці на сайтах. І нават калі шмат напісана ў посце, то гэта ўжо выклікае цяжкасці: маўляў, «шмат літар». Але ў жыцці нават такой шалёнай хуткасці заўсёды знойдуцца людзі, якія цікавяцца, якім трэба пазнанне — ад псіхалагічнага да гістарычнага. Таму што вайна — гэта гістарычная тэма. Для ўдумлівай моладзі сур'ёзная літаратура заўсёды цікавая. Ёсць такія даследаванні, што класічнай літаратурай цікавіцца 5-7 працэнтаў насельніцтва. Цікавасць ёсць, ёсць цікавасць да Быкава. Я лічу, што нашых аўтараў трэба папулярызаваць — рабіць канферэнцыі, фестывалі, тэматычныя ўрокі. Трэба паказваць людзям такую літаратуру, бо яна не толькі выхоўвае, але і дапамагае рабіць самааналіз. Калі чалавек час ад часу робіць самааналіз, то ён працуе над сабой, удасканальвае сваю душу, каб стаць Чалавекам з вялікай літары.

«ЖЫВЫ, ЧУЛЫ, З ЦУДОЎНЫМ ПАЧУЦЦЁМ ГУМАРУ»

Вольга ГУЛЕВА, загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры:

— Калі пачалі ствараць экспазіцыю «Музея-дачы Быкава» пісьменнікі хацелі захаваць мемарыяльнасць, каб у гэтым памяшканні адчуваўся дух Быкава. Вядома, можна было б зрабіць экспазіцыю, якая прадстаўляе яго як творцу, але калі пачалі працаваць разам з сям'ёй, з удавой Ірынай Міхайлаўнай над стварэннем музея, калі прыехалі на дачу, то зразумелі, што гэтае памяшканне — не вельмі вялікае — каштоўнае зусім іншым. Там захавалася атмасфера Быкава, яго рэчы, нягледзячы на тое, што яго даўно няма і на дачы яны ўжо некалькі гадоў не жылі, ёю карысталіся іншыя людзі, але вось тое, быкаўскае, у ёй засталося. Гэта сам будынак, ёсць нават нейкія аркушы з заўвагамі, дзе пазначана яго рукой, якім павінна быць гэтае памяшканне: што і дзе ў ім будзе знаходзіцца. Бо дачу яны будавалі, калі пісьменнік быў ужо не вельмі малады, яму было гадоў 60. Усё прадумвалася і ствараласа адпаведна часу, нават аздоба вагонкай, якая тады была распаўсюджана, захавалася. Гэта дача для яго была спробай збегчы з горада, з бетону, тлуму, мітусні. А там бярозкі, маляўніча. Ён, вясковы хлопец, хацеў быць бліжэй да прыроды, каб было месца адпачыць душой. На дачы ёсць кабінецік, але ёсць успаміны і згадкі пра тое, што яму там не вельмі пісалася. Затое на дачу да яго прыязджалі сябры, пісьменнікі, іншыя творцы. Алесь Адамовіч бываў, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін. Яму прывозілі падарункі. Ёсць, напрыклад, карціна мастачкі Ніны Паплаўскай. Гэты музей, на нашу думку, акрамя самой асобы Быкава, дазваляе адчуць жыццё і атмасферу, у якой існавалі творцы таго часу.



Васіль Уладзіміравіч быў вельмі ўважлівы да сяброў. Пра гэта сведчыць, напрыклад, тое, як ён перадаваў прывітанне сям'і Барадуліна, і нават узгадваў ката. Гэта толькі на фотаздымках ён выглядае сур'ёзным. У жыцці гэта быў вельмі жывы чалавек, чулы, з цудоўным пачуццём гумару — гэта можна адчуць, у прыватнасці, па яго малюнках. Усе ведаюць, што Быкаў добра маляваў. І некаторыя малюнкі мы прадстаўляем, але менавіта тыя, якія кладуцца на нашу ідэю. Бо ён маляваў і гэтую дачу, і любімую машыну — быў заўзяты аўтааматар, добра разбіраўся і сам корпаўся ў аўто. Але ёсць і расклад руху аўтобусаў на Мінск на невялічкай паперцы — мы вырашылі яе пакінуць. Застаўся гадзіннік Быкава, на якім зафіксаваны яго час. У гэтым музеі наведвальнікі могуць зрабіць вандроўку ў яго час. Мы плануем, што гэта будзе сезонны музей, але ў нашай гісторыі ёсць даты, якія прыпадаюць на вясенне-летні перыяд (Дзень Перамогі, дзень пачатку вайны, Дзень вызвалення Беларусі), з якімі звязваецца імя Васіля Быкава, пісьменніка-франтавіка. І пра гэта дзякуючы яго асобе маглі б цяпер даведвацца школьнікі, маладыя людзі. І тыя, хто хоча яго зразумець не толькі па кнігах. Можа быць, дзякуючы таму, што літаратурнай экспазіцыі ў гэтым музеі не будзе, у большай ступені ў ім можна адчуць асобу Васіля Уладзіміравіча як чалавека.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Ларыса ЦІМОШЫК.

КАЛІ НЕ Ў СМЕТНІЦУ, ТО КУДЫ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З ёй азнаёміўся старшыня сталічнага жыллёвага будаўнічага спажывецкага кааператыва (ЖБСК) «Авераж» Сяргей Іванавіч ЖУКАЎ і пасля самастойна зрабіў скрыню для збору другаснай сыравіны. Праўда, гэта быў не спецыяльны кантэйнер, але жыхарам дома ідэя спадабалася, і штоквартал скрыня забівалася пад завязку. Па словах суразмоўцы, людзі неслі ўсё, што нельга выкідваць у сметніцу: энергазберагальныя лямпачкі, батарэйкі, нават зламаныя мабільныя тэлефоны. Раз на квартал Сяргей Іванавіч выгружаў усё гэтае дабро і заносіў у Кастрычніцкі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях, што знаходзіцца каля дома. Усё было добра, але на пачатку гэтага года яму адмовілі: «лямпачкі не прымаем, бо ў нас забралі сейфы для іх захоўвання». Старшыню перанакіравалі ў вытворча-эксплуатацыйнае таварыства «Поступ», якое займаецца зборам батарэек і лямпачак. Толькі выявілася цікавая акалічнасць — за здачу адпрацаваных «змеек» трэба заплаціць.

«У першым квартале назбіралася 85 энергазберагальных лямпачак і каля 60 — напальвання, больш за сотню батарэек,— падсумоўвае Сяргей Жукаў.— Калі здаваць у «Поступ» такую колькасць, трэба мець у кішэні каля мільёна беларускіх рублёў. Вядома, у ЖБСК такіх грошай няма, трэба шукаць іншае выйсце, але дзе?». Куды падзець цэлую скрыню са шкоднымі адходамі і пры гэтым не згалець?

Гэта не да нас!

На карце greenmap.by пазначана некалькі аварыйна-выратавальных пажарных станцый, куды можна аднесці лямпачкі. Тэлефануем у Кастрычніцкі раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях. «Лямпачкі мы не прымаем, але вы патэлефануйце ў пункт прыёму, што на вуліцы С. Кавалеўскай»,— перанакіравалі мяне. «Мы прымаем толькі ртутныя гадзіннікі»,— расчароўвае жанчына, але тут жа дае іншы нумар: БелНіц «Экалогія». Цікава, што нумар зменены. Удача дазваніцца ўсміхнулася толькі праз некалькі дзён. «Гэта не да нас,— адказваюць мне.— Але вы зайдзіце на сайт Мінпрыроды, там усё пазначана». У Фрунзенскім раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях таксама адмовілі ў прыёме, перанакіраваўшы ў «Поступ». Пра «Поступ» мы ўжо ведаем з расповеда Сяргея Жукава, але на ўсялякі выпадак тэлефануем, каб удакладніць інфармацыю. Адходы тут прымаюць па цане 3990 рублёў за лямпачку напальвання і 5730 — за энергазберагальную. Але напачатку трэба здзейсніць адну працэдуру. «Напішыце заяву ў адвольнай форме з указаннем колькасці лямпачак, пасля чаго заключыце дагавор-каштарыс і з аплачанай квітанцыяй прыязджайце да нас»,— падказалі ў «Поступе». Такім чынам, заплаціўшы, можна здаць адпрацаваную лямпачку без праблем. Але каму ахвота выдаткоўваць грошы на адходы?

Званок у пажарна-аварыйную часць № 1 Цэнтральнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях стаў прыемнай нечаканасцю. «Лямпачкі мы прымаем, прывозьце. А ўвогуле прымаць павінны ва ўсіх пажарна-аварыйных часцях па месцы жыхарства»,— заўважылі мне. Атрымліваецца, адсутнічае сістэмны падыход: у адных пажарных часцях

Насцярожвае тое, што ў розных установах маюць розныя пазіцыі па пытанні збору энергазберагальных лямпачак, даходзіць нават да непаразуменняў. Напрошваецца сумная выснова: большасць выкідвае «эканомныя лямпачкі» ў сметніцу...



здаваць адходы можна, у другіх — не?..

Напрыклад, у пажарнай часці Ленінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях мяне адразу ж накіравалі ў адкрытае акцыянернае таварыства «Белкалмет», якое знаходзіцца ў пасёлку Гатава, што пад Мінскам. «А бліжэй нічога няма?» — спрабую знайсці новы пункт прыёму.— «Толькі «Экалогія-121».

Дарэчы, закрытае акцыянернае таварыства «Экалогія –121», як і «Поступ», прымае лямпачкі па дагаворах і за грошы — 8 тысяч рублёў за штуку. Працуюць яны ў асноўным з юрыдычнымі асобамі, а для фізічных пакуль што не распрацавана адпаведная дакументацыя. У ААТ «Белкалмет» лямпачкі прымаюць бясплатна толькі ад грамадзян.

Хто і каму павінен плаціць?

Намеснік начальніка аддзела па абыходжанні з адходамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Галіна МІХАЛАП вельмі здзівілася, калі пачула гісторыю пра збор лямпачак у пажарных часцях. «У нас ёсць арганізацыя «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў», якая нясе адказнасць за збор і ўтылізацыю лямпачак,— пракаментавала суразмоўца.— Па сутнасці, яны павінны пакрываць выдаткі за здачу насельніцтвам лямпачак. Гэта значыць, калі вы прыйдзеце з дагаворам-каштарысам, вам вернуць усе вашы грошы. У тым выпадку, калі лямпачкі збіраюцца са складу адходаў вытворчасці, плаціць павінен уласнік».

У дзяржаўнай установе «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» запэўнілі, што выдаткі кампенсуюць толькі фізічным асобам, а не юрыдычным. У нашым выпадку Сяргей Іванавіч выступае як юрыдычная асоба, але нішто не забараняе яму здаваць лямпачкі ў якасці шараговага грамадзяніна. Пра пажарныя часці тут чулі ўпершыню, хоць і падкрэслілі — калі магчымасць ёсць, здавайце. Абы толькі не ў сметніцу! Нам параілі звярнуцца на прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Смеццесартавальная станцыя «Заходняя»: тут і праўда прымаюць лямпачкі бясплатна… Але ад фізічных асоб, юрыдычным давядзецца плаціць. Сярод іншых пунктаў прыёму былі пералічаны «Поступ», ААТ «Электратэхімпарт», «Белкалмет».

Падтрымайце ініцыятыву!

Насцярожвае тое, што ў розных установах маюць розныя пазіцыі па пытанні збору энергазберагальных лямпачак, даходзіць нават да непаразуменняў. Калі не ведаюць, значыць, людзі не так актыўна здаюць? Напрошваецца сумная выснова: большасць выкідвае «эканомныя лямпачкі» ў сметніцу…

А неабыякавы Сяргей Іванавіч будзе здаваць лямпачкі бясплатна ў пажарную часць № 1 Цэнтральнага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях горада Мінска, але калі і гэта стане немагчымым, ён стане збіраць адходы радзей — усё ж ехаць у іншы канец горада са скрыняй адходаў цяжка.

Вядома, што ў Беларусі працэс збору і ўтылізацыі лямпачак толькі наладжваецца, хаця ён у інтарэсах і дзяржавы, і насельніцтва. Пра вопыт нідэрландскіх калег, якія прапануюць у кожнай кватэры завесці асобную скрыню для адпрацаваных батарэек і лямпачак, мы можам толькі марыць. Але ж можна неяк спрасціць існуючую сістэму?

Кацярына РАДЗЮК.

Гэта быў не спецыяльны кантэйнер, але жыхарам дома ідэя спадабалася, і штоквартал скрыня забівалася пад завязку. Людзі неслі ўсё, што нельга выкідваць у сметніцу: энергазберагальныя лямпачкі, батарэйкі, нават зламаныя мабільныя тэлефоны.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 22 июля 2014 г. АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

по продаже права заключения договоров аренды следующего имущества, в рамках 156-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

№ предмета аукциона	Местонахождение имущества	Площадь (кв. м.)	Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы	Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.)	Целевое использование имущества	Сумма задатка (руб.)	Характеристика имущества
Арендодатель – ГУ «Главное управление по обслуживанию дипломатического корпуса и официальных делегаций «Дипсервис», тел. +375(17)284 89 50; +375(29)756 99 42							
68	г. Минск, пл. Свободы, 11	19,3	3,0	492 150	Под административные цели (офис)	49 200	Помещение № 15 на первом этаже здания. Договор аренды заключается сроком на 3 года.
Арендодатель – РУП «Главное управление капитального строительства» Управления делами Президента Республики Беларусь, тел. +375(17)328 47 55							
69	г. Минск, ул. К. Маркса, 16	42,1	3,0	1 073 550	Под административные цели (офис), оказание услуг населению (риэлтерских, образовательных, туристических и других услуг по согласованию с арендодателем, за исключением общественных объединений, коллегии адвокатов, центров поддержки предпринимательства).	107 300	Помещения №№ 1-3 на втором этаже здания в изолированном помещении № 3. Имеются естественное освещение, отопление. Вход и санузел совместно с другими арендаторами. Помещения укомплектованы мебелью (стулья, столы, шкафы). Договор аренды заключается сроком на 3 года.
70	г. Минск, ул. К. Маркса, 16	30,2	3,0	770 100	Под административные цели (офис), оказание услуг населению (риэлтерских, образовательных, туристических и других услуг по согласованию с арендодателем, за исключением общественных объединений, коллегии адвокатов, центров поддержки предпринимательства).	77 000	Помещения №№ 15, 16 в подвале здания в изолированном помещении № 5. Имеются естественное освещение, отопление. Вход и санузел совместно с другими арендаторами. Помещения укомплектованы мебелью (стулья, столы, шкафы). Договор аренды заключается сроком на 3 года.
71	г. Минск, ул. К. Маркса, 16	21,2	3,0	540 600	Под административные цели (офис), оказание услуг населению (риэлтерских, образовательных, туристических и других услуг по согласованию с арендодателем, за исключением общественных объединений, коллегии адвокатов, центров поддержки предпринимательства).	54 000	Помещения №№ 2, 3 на четвертом этаже здания в изолированном помещении № 8. Имеются естественное освещение, отопление. Вход и санузел совместно с другими арендаторами. Помещения укомплектованы мебелью (стулья, столы, шкафы). Договор аренды заключается сроком на 3 года.
72	г. Минск, ул. К. Маркса, 16	27,1	3,0	691 050	Под административные цели (офис), оказание услуг населению (риэлтерских, образовательных, туристических и других услуг по согласованию с арендодателем, за исключением общественных объединений, коллегии адвокатов, центров поддержки предпринимательства).	69 100	Помещения №№ 7, 9 на четвертом этаже здания в изолированном помещении № 9. Имеются естественное освещение, отопление. Вход и санузел совместно с другими арендаторами. Помещения укомплектованы мебелью (стулья, столы, шкафы). Договор аренды заключается сроком на 3 года.

Договор аренды по предметам аукциона №№ 68-72 заключается сроком на 3 года.

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Аукцион состоится **22 июля 2014 г.** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность осмотра Имущества, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель.** Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

Лицо, желающее принять участие в аукционе:

- уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением!)** по соответствующему предмету торгов **(назначение платежа – задаток для участия в аукционе № 156 от 22.07.2014 по предмету аукциона №_____),** перечисляемый на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

- подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

индивидуальный предприниматель:

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

физическое лицо – копии **платежного документа** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 23 июня 2014 г. по 16 июля 2014 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 15 000 000 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Важно! *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды помещения, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

Договора аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефоны для справок: отдел аукционов – +375 (17) 327 40 22, отдел аренды – +375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, бухгалтерия – +375 (17) 328 36 58.

Интернет: www.mgcn.by.

Сямейная газета

■ Быць разам

Выпуск № 8 (12)

ТАКАЯ ЦЯЖКАЯ СПРАВА

Сабралася ў водпуск з сям'ёй. «Як табе шанцуе — водпуск!» — з зайздрасцю ўздыхаюць адны сябры. Іншыя спачувальна перапытваюць: «З сям'ёй? Забудзься на адпачынак, спакой табе будзе толькі мроіцца».

Сапраўды, арганізацыя летняга сямейнага адпачынку для многіх робіцца галаўным болем. Прычым датычыцца гэта не толькі суайчыннікаў. Даследаванне брытанскай кампаніі Milton, напрыклад, выявіла, што кожная чацвёртая сямейная пара лічыць водпуск з дзецьмі стрэсам. А 6% бацькоў наогул вяртаюцца з запланаваных канікулаў з дзецьмі датэрмінова, бо... стамляюцца ад нашчадкаў! Пры гэтым 73% бацькаў і матуль прызналіся, што, адпачываючы ў атэлі, не рызыкнуць даверыць сваё дзіця няньцы, каб мець магчымасць схадзіць кудысьці адным, а 80% адзначылі, што не бавілі водпуск удваіх з таго самага моманту, як сталі бацькамі... Штосьці мне гэта нагадвае. Мабыць, анекдот пра мышэй, якія плакалі, калоліся, але працягвалі есці кактус.

У маіх бацькоў ніколі не паўставала пытанне, куды б нас, траіх дачок, «сплавіць» на лета. Пакуль былі маленькія — за шчасце лічылася выбрацца ўсім разам на мора, да бабулі з дзядулем, альбо на Брэстчыну, да бацькавых сваякоў. Калі мы ўжо вучыліся ў школе, то ўсе былі настолькі занятыя ў разнастайных дадатковых гуртках па інтарэсах, што паўнавартасна бачыліся, напэўна, толькі ў нядзелю. А ў старэйшай школе і тым больш ва ўніверсітэце, наогул, перазменкі паміж летнікамі, экзаменамі, паходамі праляталі незаўважна.

На ўсякі выпадак апытала яшчэ з дзясятак знаёмых сем'яў. Толькі ў адной бацькі і дзеці наўмысна збіраюцца адпачываць паасобку. Усе астатнія ад штодзённых стасункаў з роднымі зусім не стаміліся. Натуральна, на маштаб даследавання брытанскіх сацыёлагаў не прэтэндую, але ад сэрца крыху адлягло.

Карацей, перш чым збірацца ў адпачынак і нават планаваць яго, варта задумацца, для чаго гэта вам патрэбна: каб адпачыць з дзецьмі, адпачыць ад дзяцей альбо каб дзеці адпачылі ад вас. І ўвесь астатні год, мабыць, не трэба напружваць адно аднаго так, каб потым хацелася з'ехаць у водпуск ад уласнай сям'і?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Дзевяць «я» і адно «мы» Кавалёвых

Бывае, жыццё падкідвае такія крутыя віражы, што і не мроілі-ся сцэнарыстам папулярных серыялаў... Гэта — пра іх, Віталя і Алену Кавалёвых. Яны пазнаёміліся яшчэ падчас вучобы (ён — курсант лётнага вучылішча, яна — будучая настаўніца гісторыі) і наўрад ці зазіралі настолькі далёка ў будучыню, каб прадбачыць, што асядуць у Беларусі і народзяць 6 дзяцей. А яшчэ пераадолеюць разам шэраг няпростых выпрабаванняў лёсу і прыйдуць да веры — таксама разам.

...За дзвярыма ў вялікую і адначасова ўтульную кватэру Кавалёвых нас сустракае цэлы дзіцячы дэсант: Сярожа на правах старэйшага паказвае, дзе разувацца; Ульяна і Крысціна праводзяць у гасцёўню, а маленькі Вова «патрулюе тэрыторыю» на самакаце, пакуль дарослыя вядуць гаворку. Крыху пазней прыходзіць з заняткаў Оля. У старэйшай з дачок, Машы, цяпер сесія, а старэйшы сын Дзяніс (не, ужо айцец Дыянісій), скончыўшы Жыровіцкую духоўную семінарыю, ажаніўся і жыве асобна.

— Мы сустрэліся, калі я яшчэ вучылася ў школе. Мая сям'я жыла ў Падмаскоўі, але перыядычна наведвалася да сваякоў у Валгаград, дзе вучыўся Віталь. І я пасля даволі працяглага трохгадовага рамана ў лістах ужо ведала, што буду жонкай афіцэра, таму выбар прафесіі ў пэўнай ступені быў наканаваны. Выбірала не вузкую спецыяльнасць, а тое, што магло спатрэбіцца ў жыцці. Праўда, потым высветлілася, што і гэта не асабліва спатрэбілася, — смяецца Алена Іванаўна.

ПРА ЗМЕНУ ПРАПІСКІ І СВЕТАПОГЛЯДУ

Выпускніка Качынскага вышэйшага вайсковага авіяцыйнага вучылішча, лейтэнанта Віталя Кавалёва накіравалі ў групу савецкіх войскаў у Германіі, дзе маладая сям'я пражыла 4 гады. Калі ж гэты кантынгент войскаў на пачатку 1990-х з Германіі выводзілі, Савецкі Саюз ужо не існаваў, і перспектывы ў армейцаў былі, мякка кажучы, цьмянымі: альбо накіравацца ў Туркменскую вайсковую акругу і кватараваць літаральна ў намётах у стэпе, альбо самім шукаць прызначэнне і хоць якое жытло. Паехалі ў Гродна, дзе сям'ю ўзяла пад крыло бабуля Віталя Уладзіміравіча і дзе з'явіўся на свет першынец, Дзяніс. Потым тату перавялі ў Баравуху, што пад Наваполацкам. Там нарадзілася старэйшая дачка Маша. «Хрысціць яе паехалі на радзіму да жонкі, у Сергіеў Пасад, — узгадвае бацька вялікага сямейства, — а з лёгкай рукі Аленінай сяброўкі і мяне валіся дакладныя навукі — і раптам такая рэзкая змена «курсу»... Але адгаворваць не сталі: ні тады, калі сын вырашыў аддаць доўг Радзіме і пайшоў з апошняга курса ў армію, ні тады, калі абраў шлях духоўнага служэння.

Наогул, усе дзеці Кавалёвых чымсьці цікавяцца па-за вучобай, а бацькі дапамагаюць ім пахрысцілі. Спачатку падалося цяжкавата прытрымлівацца царкоўных канонаў. Паступова неяк уцягнуліся і ўжо самастойна прыйшлі да веры. А праз веру, магчыма, і да вялікай сям'і». Далей — у Гродна, потым у Мінск — сям'я ўжо ішла ўцаркоўленай.

— Нейкіх строгіх абмежаванняў у нашай сям'і няма. Але праваслаўныя традыцыі выконваем — пост, штотыднёвае наведванне храма, далучэнне да сакраменту, — пералічвае Алена Іванаўна. Мабыць, таму не дзіўна, што іх старэйшы сын, яшчэ маленькім паспрабаваўшы сябе памочнікам настаяцеля ў храме і наведаўшы нядзельную школу, пазней пайшоў вучыцца ў семінарыю. Хоць для бацькоў гэты выбар у пэўным сэнсе быў нечаканым і спантанным: Дзяніс паступіў у тэхнічны каледж, яму добра даваліся дакладныя навук

19 чэрвеня 2014 г. Сямейная газета

АПЕРАЦЫЯ «ЗБЕРАГЧЫ СЯМ'Ю»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Прычынай расставання можа стаць і хвароба дзяцей. У такіх выпадках да спецыялістаў па дапамогу звяртаюцца часцей за ўсё жанчыны, таму што менавіта на іх плечы кладзецца асноўны клопат.

У цэнтр звярталіся і сем'і, дзе разлад быў выкліканы «завісаннем» другой «палавінкі» ў сацыяльных сетках.

Нарэшце, самыя частыя прычыны разводу — гэта «няспеласць», непадрыхтаванасць людзей да шлюбу, здрада, насілле і залежнасць аднаго з партнёраў ад наркотыкаў ці алкаголю.

«НЯСПЕЛЫЯ» ЛЮДЗІ

Нягледзячы на сучасны «разумны» век, шмат пар уступаюць у шлюб несвядома, нават спантанна. І гэта не залежыць ад узросту пары. Людзі вырашаюць пажаніцца, таму што яны кахаюць адно аднаго і ім здаецца, што гэтага дастаткова. На самой справе побач з рашэннем пажаніцца павінна стаяць рашэнне ўзяць адказнасць за сваю «палавінку» і будучае патомства. Гатоўнасць шукаць выйсце з канфліктаў разам са сваім любімым чалавекам. Калі гэтых якасцяў няма, то пара атрымлівае шмат негатыўных эмоцый і перажыванняў, іх ілюзіі і чаканні ад браку знікаюць у першы год сумеснага жыцця.

У моманты заляцання людзі часцей за ўсё надзяляюць адзін аднаго якасцямі, якіх няма, а на тое, што не падабаецца, стараюцца не звяртаць увагі. У шлюбе той, хто заляцаўся, ужо дасягнуў сваёй мэты (звычайна гэта мужчына), і дзяўчыну чакае расчараванне.

— Мы часта чуем ад маладых дзяўчат расповеды аб тым, што да вянца яе любімы быў такі ўважлівы і пяшчотны, — кажа псіхолаг. — А потым ён стаў халодны і раўнадушны. Да таго ж, аказаўся неахайны: не мые за сабой кубачкі, раскідвае па ўсёй кватэры шкарпэткі і да т.п. На самой справе заляцанні — гэта адно, а сумеснае жыццё — іншае.

Спецыялісты лічаць, што падобныя канфлікты лёгка вырашаюцца, калі звярнуцца па дапамогу ў самым пачатку. Але бяда ў тым, што часта людзі «запускаюць» праблемы.

Так здарылася з адной дзяўчынай, якая звярнулася ў цэнтр. Яна расказала, што з мужам на мяжы разводу: яны часта сварыліся, і таму яна адчувала разгубленасць і не ведала, як сябе паводзіць. Яшчэ яе няўпэўненасць была звязана з тым, што сама яна і яе мужчына — з няпоўных сем'яў. У дзяцінстве яны не мелі прыкладу вырашэння канфліктаў з супрацьлеглым полам. На той час у шлюбе маладыя пражылі два гады. Спробы наладзіць адносіны не прывялі да поспеху.

— Маёй мэтай было спачатку супакоіць дзяўчыну, — расказвае Аксана Валер'еўна. — Працавалі над тым, каб яна навучылася не ставіцца да сябе дрэнна, настроілася на тое, каб клапаціцца аб сабе. Пераканала яе ў тым, што адказнасць за развод не можа ляжаць толькі на адным чалавеку. Калі яна стала больш эмацыянальна стабільнай, мы запрасілі на кансультацыю мужа.

Малады чалавек з самага пачатку быў не супраць звароту да спецыялістаў, але падкрэсліваў, што не бачыць магчымасці нешта змяніць. Растлумачыць, чаму ў іх сям'і такі разлад, ён не мог. Але гаварыў аб тым, што ўсё стала нецікава, нудна, аднастайна.

— У сям'і немагчыма быць проста староннім назіральнікам, — гаворыць спецыяліст. — Адказнасць за сям'ю ляжыць як на мужчыну, так і на жанчыне. Ад іх гатоўнасці вырашаць канфлікты разам залежыць іх будучае жыццё. Калі малады чалавек зразумеў, што ён таксама адказны за сітуацыю, мы запрасілі іх прыйсці адначасова.

Маладыя расказалі, што яны чакаюць ад шлюбу і што могуць даць адно аднаму. Хутка яны перадумалі разводзіцца, бо ў іх яшчэ былі пачуцці і сімпатыі.

ЗДРАДА

— Здрада — гэта незвычайны канфлікт, — працягвае Аксана Валер'еўна. — Тут больш глыбінныя перажыванні. Аднак у сітуацыі здрады сям'ю ўсё ж можна зберагчы. Гэта магчымасць залежыць ад эмацыянальнага стану чалавека, якому здрадзілі, наколькі ён ранімы, адчувальны, наколькі цяжка яму даравацьі ці ёсць у яго на гэта душэўныя сілы.

У цэнтр з гэтай праблемай звяртаюцца і маладыя сямейныя пары, і пары, якія пражылі ў шлюбе не адзін дзясятак гадоў. Па назіранні спецыялістаў, працэнт разрыву ў маладых сям'ях, дзе здарылася здрада, большы. Маладыя менш гатовы дараваць адно аднаму такую крыўду, бо ў іх амаль няма страху застацца аднаму. Яны лёгка ўспрымаюць сітуацыю: крыўдзяцца і разводзяцца.

— Але ў гэтым ёсць свая небяспека. Калі чалавек не выражае канфлікт, а пазбягае яго, то існуе магчымасць ізноў аказацца ў падобнай сітуацыі. Каб пазбегнуць такога працягу, лепш адразу разабрацца, чаму здарылася здрада.

Калі ў пары ўжо багаты вопыт сямейнага жыцця, агульная маёмасць, дзеці, моманты, пра якія можна сказаць шмат добрага, сумеснае пераадоленне цяжкасцяў, — у такой сям'і ёсць вялікая верагоднасць зберагчы шлюб нават пасля здрады.

Побач з рашэннем пажаніцца павінна стаяць рашэнне ўзяць адказнасць за сваю «палавінку» і будучае патомства.

Аксана Бланк распавяла гісторыю мужа і жонкі, якія пражылі ў шлюбе каля дваццаці гадоў. Яны былі людзьмі заможнымі і паспяховымі. Іх дзеці вучыліся ў старшых класах і ўжо не патрабавалі да сябе вялікай увагі. На фоне дабрабыту і камфорту муж і жонка пачалі кожны жыць сваім жыццём. Праўда, у іх засталіся агульныя сябры, святы, традыцыі, але пры гэтым атрымалася так, што мужчына здрадзіў.

Па дапамогу звярнулася жанчына. Яна расказала, што для яе сітуацыя здрады — невыносная. Пакрыўджаная жонка не ведала, што ёй рабіць і як далей жыць. Яна адчувала крыўду, разгубленасць, страх, віну і яшчэ шмат вельмі «непрыемных эмацыянальных перажыванняў і пачуццяў».

Увогуле, навіна аб здрадзе была для яе нечаканай. Ёй здавалася, што ў сям'і ўсё добра, бо муж нічога не гаварыў, ніякіх прэтэнзій не выказваў, проста чамусьці аддаліўся і замкнуўся ў сябе. Яшчэ — стаў больш часу праводзіць на працы.

Муж на кансультацыі ўвогуле аб здрадзе не сказаў, як і не сказаў, што не любіць жонку. Мужчына больш гаварыў пра сябе, аб тым, што ён стаміўся, што ён няўпэўнены і непаспяховы чалавек. Хаця на самой справе гэта было не так. Проста яму неабходна была эмацыянальная падтрымка, якой не хапала ў сям'і. Падчас крызісу пачаліся праблемы і ў іх дзяцей — гэта аб'яднала мужа і жонку. Яны разам сталі вырашаць праблемы дзяцей, і ім удалося нармалізаваць свае адносіны.

— Яны не падалі на развод, — расказвае спецыяліст. — Аднак у жанчыны засталася насцярожанасць, таму яна прыходзіць час ад часу, каб неяк стабілізаваць свой стан, стаць больш упэўненай у сабе і больш значнай. Такая падтрымка для жанчыны прыносіць плён для сям'і. Сапраўды, паводле славянскіх традыцый, сям'я — гэта прэрагатыва жанчыны, яна — захавальніца сямейнага ачага. Гэтае меркаванне ў многім правільнае. Калі жанчына эмацыянальна стабільная, спакойная і ўпэўненая, то сям'і гэта толькі на карысць.

Прычыны здрады могуць быць і іншыя. Ёсць ад прыроды не вельмі ўпэўненыя ў сабе людзі, якім неабходна пастаянна быць у цэнтры ўвагі, яны нібыта заўсёды маюць патрэбу ў новым, у доказах сваёй прыцягальнасці. Самы лёгкі спосаб задаволіць такую патрэбу — завесці новыя рамантычныя адносіны. Ёсць і іншыя спосабы ўрэгуляваць такую праблему ў сям'і. Можна, напрыклад, разам падарожнічаць, змяняць час ад часу сваю дзейнасць, увогуле старацца ствараць у доме пастаянны эфект новага. Тады ў «неспакойнага» партнёра звычайна знікае жаданне шукаць «прыгоды» на старане.

— Не заўсёды здрада яўляецца пускавым механізмам разводу, — тлумачыць псіхолаг. — Звычайна гэта наступствы нейкай сітуацыі ці крызісу. І калі нам удаецца ўрэгуляваць гэты крызіс, то здрада застаецца толькі непрыемным этапам у жыцці сям'і. Тады людзі, якія кахаюць адно аднаго, могуць «зачыніць дзверы», пайсці далей і жыць не азіраючыся.

РАЗВОД ЯК ВЫЙСЦЕ

Само гэтае словазлучэнне «развод як выйсце» гучыць ненатуральна. Але спецыялісты лічаць, што такое спалучэнне слоў мае права на існаванне.

У моманты заляцання людзі часцей за ўсё надзяляюць адзін аднаго якасцямі, якіх няма, а на тое, што не падабаецца, стараюцца не звяртаць увагі.

І ў першую чаргу ў сітуацыях, калі ў сям'і здараюцца сур'ёзныя акты насілля. У такіх выпадках нават псіхолагам складана дабіцца нейкіх станоўчых вынікаў.

— Іх задачай становіцца стабілізацыя стану ахвяры, — гаворыць псіхолаг. — Як паказвае практыка, апошнія адчуваюць сваю віну ў тым, што адбываецца ў іх сям'і. Бывае так, што ахвяры не звяртаюцца па дапамогу. І нават калі яны аказваюцца на прыёме ў спецыяліста, то прычынай звароту звычайна становяцца дзеці, у якіх пачынаюцца праблемы з паводзінамі ці з паспяховасцю ў школе.

Таксама развод стане выйсцем для сям'і, дзе адзін з партнёраў залежны ад наркотыкаў ці алкаголю. Праўда, калі залежны матываваны на тое, каб зберагчы сям'ю, то ў выніку паспяховай рэабілітацыі ў пары ёсць шанц пражыць доўгае і шчаслівае жыццё.

— Задача нашага цэнтра — зберагчы сям'ю, — гаворыць Аксана Валер'еўна. — Аднак не наперакор жыццю і жаданням чалавека. Ёсць у маёй практыцы сем'і, якія інтуітыўна адчуваюць, што ім разам дрэнна. Яны не залежныя, у іх няма сітуацыі здрады, але ёсць такое адчуванне, што калі яны расстануцца, то ў іх будзе час стварыць больш паспяховую сям'ю. Звычайна ў такіх пар кардынальна не супадаюць погляды на шлюб, прынцыпы, нормы, правілы ўзаемадзеяння, і гэта цягне за сабой толькі раздражненне, непрыязь і непавагу. Такі шлюб не прыносіць шчасця. Аднак такіх пар не шмат. Звычайна, калі людзі кахаюць адно аднаго, яны спрабуюць зберагчы адносіны. Толькі лепш гэта рабіць адразу, калі канфлікт яшчэ не востры. І не трэба баяцца звяртацца па дапамогу да спецыялістаў. Наша задача — навучыць сямейную пару гаварыць і слухаць адно аднаго.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ДЛЯ ЎСІХ ТАТАЎ

Бацька — гэта не толькі «хадзячы банкамат»

Роля таты ў сучаснай сям'і раскрыта няпоўнасцю. Як правіла, яму адводзіцца доля здабытчыка грошай і абаронцы. Але чамусьці на другі план адыходзіць выхаванне дзіцяці. Хаця менавіта ад гэтага і залежыць тое, з якім характарам вырастаюць сын або дачка.

— Дзень бацькі ў Беларусі, на жаль, свята неафіцыйнае, — гаворыць **начальнік упраўлення сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Камітэта па працы і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Дзіяна ДЗЯМІДАВА.** — Але спадзяёмся, што ўсё яшчэ ў нас наперадзе! Трэба паціху адыходзіць ад стэрэатыпаў. Бо з-за іх мы забываемся, што тата — гэта ў тым ліку і сябар для дзіцяці...

І таму бацькі за некалькі хвілін паказалі, што яны могуць быць майстрамі на ўсе рукі. Яны пабывалі па чарзе і казачнікамі, і мастакамі на асфальце, і снайперамі з вадзяных пісталетаў, цэлілі шарамі ў кеглі, гулялі ў дартс, з заплюшчанымі вачыма кармілі дзяцей ёгуртам ... Асілкі ж спрабавалі ўтрымаць на сабе як мага больш дзяцей.

— Па традыцыі, мы праводзім свята напярэдадні Міжнароднага дня бацькі, які адзначаецца ў трэцюю нядзелю чэрвеня, — гаворыць **Міхаіл МАЦКЕВІЧ, мадэратар груп праекта «Тата-школа»**. — З яго дапамогай мы хочам звярнуць увагу на прысутнасць бацькі ў сям'і, бо тата павінен перастаць быць выключна «хадзячым банкаматам». Адметна, што ўдзельнічаюць у сённяшніх спаборніцтвах у тым ліку і шматдзетныя сем'і.

Калі бацька рэалізаваўся ў сям'і — поспех яго будзе чакаць ва ўсіх сферах жыцця. Гэта і становішча на працы, і матэрыяльны дабрабыт, і душэўны спакой, і здароўе. Таму Дзень бацькі ў сталіцы — гэта і ёсць адна вялікая забаўляльная праграма, у якой сям'я можа прадэманстраваць сваё адзінства, згуртаванасць. А паўдзельнічаць у конкурсах на любы густ мог кожны наведвальнік парка Горкага.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. Фота аўтара.

■ Свята

УНУКІ НА ЛЕТА: ЗА І СУПРАЦЬ

Валянціна МУРАЎЁВА, працуючая пенсіянерка:

— Я за тое, каб мне давяралі ўнукаў. Праўда, я яшчэ працую, але ў будучыні з задавальненнем буду браць унукаў на лета. Калі не я, то хто? Маім дзецям не трэба наймаць няньку, бо ў іх ёсць бабуля! Сёння дапамагаю тым, што ў дзіцячы садок заводжу і забіраю. Пакуль бацькі на працы, з малымі і павячэраю, і пагуляю. Шкада толькі, што мае дзеці не заўсёды згодны пакінуць мне ўнукаў на ноч. Люблю пра іх клапаціцца.

У сучасных мам ёсць вялікі плюс — дэкрэтны водпуск да трох гадоў. За гэты час бацькі наладжваюць добрыя адносіны са сваім дзіцем. Аднак паўстала іншая праблема. Дзіця страшна на вуліцу выпусціць. А трэба, каб малое развівалася: хадзіла на гурток па маляванні, у музычную школу, на плаванне...

Калі мы гадавалі сваіх дзяцей, то амаль не бачылі іх, таму што раней дэкрэтны водпуск давалі толькі на некалькі месяцаў. Таму мае падгадаваныя дочкі ўжо хадзілі ў садок. У нас была адна бабуля, але яна не дапамагала гадаваць дзяцей. Працавала я на заводзе з 8 раніцы і да 5 вечара. Забірала малых з садка, ішла ў краму, пасля дома мы вячэралі — і ўсё, спаць! Таму я амаль не бачыла, як растуць мае дзеці.

Магчыма, з-за гэтага мне так падабаецца бавіць час з унукамі, назіраць за тым, як яны растуць. Яны ж такія цікавыя! З імі кніжкі чытаю, гуляю, развіваю, расказваю пра сябе і слухаю іх. Нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць. Я гэта называю другой маладосцю. Калі мае дзеці былі малыя, я ўсё спяшалася і радавалася таму, што яны з кожным годам станавіліся больш самастойнымі. А вось з унукамі ўсё па-іншаму, ужо неяк свядома назіраеш за іх сталеннем, але таксама радуешся, што вось яны, нашы маленькія, — растуць!

Хачу, каб у маіх унукаў дзяцінства было вясёлае, шумнае і поўнае любові. Таму лічу, што сёння як ніколі бабулі павінны часцей браць да сябе ўнукаў — каб у іх былі добрыя і прыемныя ўспаміны.

Сяргей СТАРАВОЙЦЕНКА, працуючы пенсіянер:

— Браць унукаў да сябе нармальна — гэта ж родныя маленькія чалавечкі. Але я не ўпэўнены, што трэба браць унукаў на ўсё лета. Па-першае, лічу, што выхаваннем дзяцей павіны займацца бацькі (а лета — гэта даволі доўгі тэрмін). Па-другое, сёння пенсіянеры стараюцца трохі падзарабіць, каб дапамагчы, зноў жа, гадаваць дзяцей сваім дарослым дзецям. Водпуск у пенсіянераў, якія працуюць, каля месяца, таму на лета ніяк не атрымаецца ўзяць унукаў. Па-трэцяе, самім пенсіянерам таксама хочацца адпачыць.

Але калі дзядуля і бабуля ўжо не працуюць і дзеці з імі дамовяцца, то чаму не? Тым больш калі старэйшае пакаленне жыве ў вёсцы і бачаць сваіх унукаў раз на год, летам, то для абодвух бакоў гэта выйсце.

У маладосці сваіх дзяцей мы гадавалі самі. Мае бацькі працавалі і таксама жылі ў Мінску, таму і магчымасці аддаць дзяцей на лета ў нас не было. Затое нашы дзеці адпачывалі ў піянерскіх летніках. У водпуск ездзілі на дачу ўсе разам: бабулі, дзядулі, бацькі, дзеці і ўнукі.

У дзяцінстве я адпачываў і ў піянерскіх лагерах, і ў бабулі, якая жыла ў вёсцы. Праўда, у той час у сёлах усе працавалі: ад малых да вялікіх. І таму з гадоў васьмі я і іншыя дзеці на канікулах у бабулі працавалі разам з дарослымі: лён варочалі. Але ўспаміны ўсё роўна добрыя. Таму што пасля працы і на рэчку хадзілі, і гулялі з сябрамі, ды ўвогуле адчувалі сябе свабоднымі ад школы і заняткаў.

Сёння мы з жонкай з задавальненнем бяром унукаў да сябе. Некалькі разоў за лета мы адпачываем з імі на дачы. Бывае, што ездзім разам у санаторый. Але ўсё роўна гэта не ўсе тры месяцы. Мы дапамагаем гадаваць унукаў, але выхоўваюць іх бацькі. Так і павінна быць.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Дзевяць «я» і адно «мы»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— У мяне быў крызіс выбару. Да таго, як з'явілася чацвёртае дзіця — Уля, я будавала планы наконт далейшага развіцця ў прафесіі: хацелася і аспірантуру скончыць, і кандыдацкую абараніць, у навуку пайсці... Але потым усвядоміла, што трэба кардынальна змяняць светапогляд і змірыцца з тым, што ў мяне, відаць, іншае прызванне ў жыцці, — мякка ўсміхаецца Алена Кавалёва. — Калі Бог дае дзяцей, я абсалютна пераканана: гэта не выпадковасць, а Яго задума. Напэўна, у кожнага ў жыцці здараецца момант складанага выбару паміж тым, што табе хацелася б зрабіць, і тым, як складваюцца жыццёвыя абставіны. І тут варта прыслухацца да таго, што дасылаецца зверху. Гэта не значыць, што мы знаходзімся ў нейкай эйфарыі і ўсё ўвесь час ідзе гладка і ўзорна-паказальна. Не, безумоўна, гэта вельмі цяжка. Мне ёсць з чым параўноўваць. У адрозненне ад тых шматдзетных мам, якія пасля вяселля адразу нарадзілі адно, другое дзіця і ішлі з дэкрэту ў дэкрэт, у нас паміж некаторымі дзецьмі розніца ў 5 гадоў. Так што я пабывала і ў «скуры» працуючай мамы з дзецьмі, і ў стане, калі твая галоўная прафесія — мама. Розніца вялікая, і сапраўды, калі малых некалькі, гэта вельмі цяжка.

Алена Кавалёва ўзнагароджана ордэнам Еўфрасінні Полацкай.

— Калі дзеці падраслі, пачыналі дапамагаць па доме?

— Цяпер пачалася «адпускная пара» ў школах, таму я з чыстым сумленнем магу даць дзяўчаткам анучы ў рукі, Сярожу — пыласос, і прыборка робіцца значна хутчэйшай і больш эфектыўнай.

— У кожнага ёсць хоць маленькі, але свой абавязак, — дадае бацька. — Хто даглядае і прыбірае за кошкай, хто ў краму сходзіць, хто смецце выносіць...

А яшчэ яны ўсе разам рыхтуюцца да свят. Самыя любімыя ў сям'і — Каляды і Вялікдзень. Запамінальнымі стараюцца зрабіць і дзіцячыя дні нараджэння — то апрануцца ўсе ў адмысловыя касцюмы, то паклічуць дадому казачных персанажаў... Калі выпадае час, проста гуляюць то ў Батанічным садзе, то ў зялёным парку Перамогі; былі ў Мірскім замку, на чарзе — Нясвіжскі. Мараць «прафесійна» заняцца турызмам, каб аб'ехаць і паглядзець усім разам як мага больш цікавых мясцін.

ПРА ГОРКАЕ СЛОВА «ХАЛЯВА»

— Распаўсюджаны стэрэатып, што шматдзетныя сем'і — неўладкаваныя, у іх не глядзяць за дзецьмі, а нараджаюць дзеля квадратных метраў ды льгот...

— На побытавым узроўні сутыкаешся як з добразычлівасцю, так і з прадузятасцю. Некаторыя пачынаюць табой захапляцца — не ведаю, наколькі шчыра. Іншыя — успрымаюць у штыкі. Але часцей, на жаль, здараецца апошняе, — пагаджаецца Алена Іванаўна. — Перадусім адчуваецца зайздрасць наконт жылля: «Мы за вас падаткі плацім, а вы кватэры атрымліваеце». Ведаеце, я вазьму на сябе смеласць сказаць за многіх шматдзетных мам: мы не маем патрэбы ва ўсеагульнай падтрымцы, спансіраванні, ахвяраваннях і г.д. Але разуменне нам вельмі патрэбна. Бо вельмі непрыемна, калі прыніжаюць у паліклініках — ці то ў чэргах, ці часам самі медработнікі, мяркуючы, што ты імкнешся «па-лёгкаму праскочыць». Нямногія ведаюць, як гэта — выседзець на прыём з двума, трыма, чатырма дзецьмі. Уяўляеце, які кавалак жыцця я правяла ў паліклініках, каб прайсці прафагляды, зрабіць прышчэпкі, атрымаць бясконцыя даведкі ў садок, школу, басейн, летнік? Падобная ж сітуацыя ва ўстановах адукацыі, дзе пастаянна трэба рабіць бацькоўскія ўнёскі, прычым з кожным годам усё больш. За ўсё жыццё, мабыць, толькі двойчы я сустрэла чалавечае стаўленне і разуменне ў гэтым пытанні.

У Мінску, кажуць Кавалёвы, усё нашмат зручней для шматдзетнай сям'і, большасць крам, дзіцячых паліклінік, садкоў і школ — у крокавай даступнасці. І ўсё адно, калі дзеці падрастаюць і ходзяць па секцыях, музычных і спартыўных школах, машына робіцца жыццёвай неабходнасцю. Таму, атрымаўшы новую кватэру (амаль адначасова з узнагароджаннем Алены Іванаўны ордэнам Маці), зусім нядоўга спрачаліся, што больш патрэбна — новая мэбля або машына. Перамагло пытанне эканоміі маміных сіл, здароўя і часу.

Калі Бог дае дзяцей, я абсалютна пераканана: гэта не выпадковасць, а Яго задума.

ПРА ЎСІХ І КОЖНАГА

Нават калі малыя пачынаюць спаборнічаць за ўвагу, Алена Іванаўна не дае нарадзіцца канфлікту і для кожнага знаходзіць патрэбныя словы. Бо ведае, каго з дзяцей трэба заахвоціць, а каго і прымусіць, каго пашкадаваць, а каго падштурхнуць. «Дзяніс — вельмі дысцыплінаваны. У ім з дзяцінства адчуваўся стрыжань старэйшага сына. Я часам шкадую, што ён ужо доўга не жыве з намі (спачатку была армія, потым семінарыя), бо астатнім не было на каго раўняцца. Маша — вельмі энергічная, імпульсіўная і эмацыянальная, камунікабельная, яна душа любой кампаніі. Вось толькі маленькі штрых: яна тры гады таму скончыла школу, а настаўнікі дагэтуль яе добра памятаюць. Вольга ў нас па-сапраўднаму жаноцкая, хоць спорт унёс свае карэктывы. А яшчэ яна любіць дакладнасць ва ўсім і не любіць спазняцца, у адрозненне ад старэйшай сястры. Ульяна — чалавечак у сабе, нешматслоўная, з людзьмі сыходзіцца складана, затое вельмі прывязваецца да сяброў. Старанная і адказная — яе не трэба прымушаць займацца, а да музыкі настолькі здольная, што, я спадзяюся, гэта будзе яе прафесія. Сярожа пакуль што знаходзіцца ў пошуку сябе — мне здаецца, у яго артыстычная натура, ён цікаўны, эмацыянальны, часам нават празмерна. Яму, вядома, няпроста, бо старэйшы брат далёка, і над ім пераважаюць жанчыны ў выглядзе трох старэйшых сясцёр — але нічога, спраўляецца».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

Дошка з выдрапанай на ёй карцінай — падарунак да дня нараджэння будучай шматдзетнай мамы Алены — захоўваецца ў Кавалёвых як напамін пра іх «раман у лістах».

Найменшы з усіх Вова, як тое кацяня, лашчыцца да бацькоў і амаль не сыходзіць з рук. Хто б здагадаўся, што за гэтай узаемнай пяшчотай хаваецца няпростая гісторыя...

ПРА ВЫПРАБАВАННІ НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Чакаючы шостае дзіця, Алена Іванаўна цяжка захварэла. Схуднела да 46 кілаграмаў, бо нічога не магла есці, з-за слабасці і болю амаль не хадзіла. А ўрачы ўсё ніяк не маглі вызначыцца з дыягназам. «Вы ўпэўнены, што вам патрэбна шостае дзіця?» — пыталіся некаторыя медыкі. «Як быццам мы стаім на вуліцы і гаворым пра бяздомнае кацяня. Што на гэта можна адказаць? Як за 5 хвілін выкласці чалавеку свой светапогляд, усю метафізіку?» — разводзіць рукамі мама Алена. А тады яна проста сціскала зубы і моўчкі працягвала барацьбу — за малога і за сябе.

Не ведаю, якія найвышэйшыя сілы ўбачылі гэта і пачулі малітвы, але адбыўся звычайны цуд. Знайшлася ўрач, якая паставіла правільны дыягназ і «прабіла» ў калег тэрміновую аперацыю. Іх потым спатрэбілася нават некалькі. І пакуль Вова, які нарадзіўся 7-месячным, дабіраў вагу ў РНПЦ «Маці і дзіця», Алена Іванаўна змагалася з хваробай. «Пасля аперацыі ўжо на другі дзень я хадзіла самастойна па рэанімацыі. Медсястра толькі дзівілася: маўляў, за 20 гадоў такое першы раз бачу. Я кажу: «Ведаеце, колькі чалавек за мяне моляцца? Родныя, сябры, знаёмыя, знаёмыя знаёмых...».

А год таму ў Кавалёвых стала сямёра дзяцей — з Асіповіцкага прытулку пад апеку сям'і трапіла Крысціна, чыя маці пазбаўлена бацькоўскіх правоў. «Мы з Воляй наведвалі па сваіх справах бальніцу, куды прывезлі на абследаванне і Крысціну. Нехта з медсясцёр расказаў, што Крысціне перыядычна патрэбна лячэнне, і што, акрамя той маці, у дзяўчынкі больш нікога няма на ўсім свеце. Мы даўно хацелі ўзяць дзіця з прытулку, і тут, мабыць, лёс», — калі Алена Іванаўна ўзгадвае, як у душы ўсё перавярнулася, у яе крыху дрыжаць вусны. Мы размаўляем амаль паўшэптам, каб не патрывожыць горкімі ўспамінамі саму дзяўчынку, якая ўвесь час падыходзіць то паказаць тату, як яна гожа зрабіла малюнак, то абняць маму і раўніва папярэдзіць нас: «Гэта МАЯ мама!». Але і сваю, біялагічную, маму дзяўчынка таксама вельмі любіць і добра памятае: у прытулку яна правяла ўсяго паўгода. Віталь Уладзіміравіч і Алена Іванаўна гэта добра разумеюць, таму не ставяць перад сабой задачу цалкам замяніць Крысціне родных бацькоў. У іх мэта значна больш простая і складаная адначасова — падзяліцца з дзіцем шчасцем... Старэйшыя дзеці навіну аб тым, што іх стане яшчэ больш, успрынялі спакойна: маўляў, дзе шасцёра, там і сямёра, усе свае. Апеку Віталь Кавалёў афарміў на сябе. «Натуральна, мы прыкіпелі да дзіцяці. Але калі яе маці адновяць у бацькоўскіх правах, я буду толькі рада, што яны ўз'яднаюцца. Пакуль жа спрабую зрабіць усё, каб яна расла шчаслівым і добрым чалавечкам», — зазначае мама Алена. І перад тым, як развітацца, мы цікавімся ў Кавалёвых: якая яна — шчаслівая сям'я?

— Перадусім, думаю, дружная, — разважліва адказвае бацька. — Бо я сустракаў сем'і, дзе старэйшым перашкаджаюць малодшыя, а бацькам не хапае часу на дзяцей. А вось мой бацька вырас у вялікай сям'і, і яны ўжо дарослымі людзьмі ўсё жыццё сябравалі, стараліся часцей збірацца і падтрымлівалі адно аднаго.

— Шчаслівая сям'я — тая, у якой усім хочацца знаходзіцца разам. Калі паміж мужам і жонкай ёсць узаемаразуменне і давер, і стасункі будуюцца не на эгаістычным абмене «ты — мне, я — табе», а на агульным інтарэсе. А яшчэ добрая сям'я — гэта адказнасць і дакладная сістэма каштоўнасцяў. Я сваім дзяўчатам спрабую тое самае ўнушыць. Наколькі атрымаецца — жыццё пакажа.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ Фотаздымак з гісторыяй

ДЗВЕ АРМІІ, ЯКІХ УЖО НЯМА

Памяць пакаленняў, сувязь паміж продкамі і нашчадкамі — тыя рэчы, для якіх не існуе бар'ераў у часе, прасторы або спосабе стасункаў. Гэта яшчэ раз пацвердзіў у сваім лісце ў рэдакцыю Васіль Рослаў: «Чытаю газету найперш з прафесійнай зацікаўленасці і службовых абавязкаў, у прыватнасці, адсочваю аб'явы аб продажы нерухомасці і абсталявання, але калі нейкая іншая інфармацыя зацікавіць, не праходжу міма. Вось звярнуў увагу і на матэрыялы ў рубрыцы «Фотаздымак з гісторыяй», вырашыў распавесці сваю гісторыю».

Розніца паміж «старэйшым» і «малодшым» здымкамі, якія даслаў у нашу рубрыку Васіль Міхайлавіч, складае больш чым 65 гадоў. І ўсё ж яны шчыльна і няўлоўна звязаныя — і не толькі таму, што на іх сфатаграфаваны дзед і ўнук, але і таму, што з'яўляюцца доказам выразу «гісторыя паўтараецца».

«На першым фота — мой дзед Васіль Лукіч (2-і злева ў верхнім радзе), які служыў яшчэ ў царскай арміі дзесьці ў Сібіры. На другім, з дэмбельскага альбома — я сам, яго ўнук (на здымку я адзіны без фуражкі), а фотаздымак зроблены ў 1984 годзе пасля службы ўжо ў Савецкай Арміі — служыў я, дарэчы, у Беларусі. І ведаеце, чым яшчэ, акрамя нашага сваяцтва і таго, што ніводная з гэтых армій цяпер не існуе, блізкія гэтыя здымкі? Іх злучае факт, не зусім характэрны для XX стагоддзя — стагоддзя двух сусветных, грамадзянскай, інтэрнацыянальнай (у Афганістане) войнаў і яшчэ мноства ваенных канфліктаў. Пры ўсім гэтым, як ні дзіўна, ні дзеду (1890 года нараджэння), ні майму бацьку Міхаілу Васільевічу, які служыў на Урале ў 50-х гадах, ні мне, на шчасце, не давялося прымяніць у жыцці тое, чаму нас вучылі ў арміі — ваяваць.

Але няма, напэўна, у нас ніводнай сям'і, якую не закранула б тая ці іншая вайна. На фронце ў снежні 1943 года прапаў без вестак мой другі дзед, бацька мамы Крываносаў Іван Іванавіч 1909 года нараджэння. Яго жонка, мая бабуля Надзея Лявонаўна, узнагароджана медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны». А мой стрыечны брат, Рослаў Аляксандр Іванавіч, ваяваў у Афганістане... І ўсё гэта — не толькі сямейная, але і гістарычная памяць, якую трэба ведаць, берагчы і захоўваць, каб найгоршыя старонкі гісторыі ўсё ж не паўтараліся».

❍ ❍ ❍

Шаноўныя чытачы! Мы працягваем гартаць сямейныя альбомы разам. Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце, калі ласка, на рэдакцыйную пошту альбо электронную скрыню info@zviazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.

Увага! Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.

ЯК ДЗІЦЯ СПАВІВАЦЬ,

або Першая вопратка

Пялёнкі дзіцяці, тое, у чым яно расце і развіваецца на працягу першага года жыцця, у народнай культуры параўноўвалі з палотнамі, якія выкарыстоўвалі ў час вяселля ці пахавальнага абраду. Лічылася, што непасрэдны кантакт дзіцяці з пялёнкамі і іншым адзеннем мае пэўны ўплыў на яго будучы характар, здароўе і ўдачу. Таму да іх вырабу і выкарыстання існаваў цэлы шэраг патрабаванняў.

1 Звычайна пялёнкі шылі са старой пасцельнай бялізны або адзення тых дамачадцаў, чый характар і стан здароўя не выклікалі трывогі.

2 А вось для абраду хрышчэння пялёнкі шылі з новай, абавязкова белай (светлай) тканіны, упрыгожвалі іх вышыўкай, карункамі. Спавівач (пояс, якім спавівалі дзіця) быў абавязкова чырвонага колеру. У царкве хросная маці павінна была на працягу ўсяго абраду трымаць пялёнкі і спавівач, каб такім чынам «адзенне» хрэсніка таксама было асвячоным. Дарэчы, надалей «хрэсьбінныя» пялёнка і спавівач лічыліся надзейным абярэгам для немаўляці: іх клалі ў калыску, бралі з сабой, калі надоўга выносілі дзіця з хаты.

3 Пялёнкі, у якіх хрысцілі дзіця, у штодзённым жыцці болей не выкарыстоўвалі. Іх прасавалі і захоўвалі, каб скарыстаць у час хрышчэння наступнага дзіцяці. Казалі, што дзеці, хрышчоныя ў адным адзенні, будуць сябраваць паміж сабой і клапаціцца адно аб адным. Гэтак жа ставіліся да іншага дзіцячага адзення, цацак.

4 Нашы прабабулі лічылі, што тугое спавіванне надасць дзіцяці стройнасць фігуры і будзе спрыяць яго росту. Стараліся, каб на працягу першых 9 дзён дзіця спавівала бабка-павітуха.

5 З пялёнкамі прыходзілі жанчыны ў «адведкі», наогул пялёнкі былі абавязковым падарункам для бацькоў дзіцяці.

6 На працягу 40 дзён пасля нараджэння дзіцяці пялёнкі не выносілі сушыць на двор. Наогул, мыць і сушыць пялёнкі дазвалялася толькі раніцай. Лічылася: той, хто пакідаў пялёнкі на двары пасля заходу сонца, мог наклікаць на дзіця невылечныя хваробы, дзіця магло страціць сон, стаць плаксівым.

7 Пялёнкі забаранялася выкарыстоўваць для іншых мэтаў: у іх можна было толькі спавіваць дзяцей.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

5 ФІЛЬМАЎ для сямейнага прагляду

Ганна АНДРУШЭВІЧ, рэдактар кінакампаніі СТБ (Масква):

1. Поўнаметражны анімацыйны фільм «Ку! Кін-дза-дза». Пачатковец дыджэй Толік і сусветна вядомы віяланчэліст Уладзімір Чыжоў сустракаюць на шумнай маскоўскай вуліцы босага чалавека, націскаюць на кнопку дзіўнай прылады і перамяшчаюцца на пустынную планету Плюк... Так-так, гэта анімацыйны рымейк знакамітага фільма Георгія Данелія. Мне падабаецца сучаснае прачытанне гэтай гісторыі: актуальнасць яна не страціла, быць можа, яшчэ і набыла новыя сэнсы.

2. Фільм «5 нявестаў» Карэна Аганесяна. Часта кажуць, што цяпер камедыі не ўмеюць здымаць. Не ведаю, асабіста я глядзела гэты фільм у 2011 годзе на Маскоўскім кінафестывалі і смяялася ад усёй душы. Наіўнае і добрае кіно ў стылістыцы пасляваенных карцін — пра тое, як лётчыкі ў 1945 годзе хацелі жаніцца і баяліся, што ўсіх нявестаў разбяруць.

3. «Пра Фядота-стральца, удалога малайца». Яшчэ адзін поўнаметражны анімацыйны фільм — экранізацыя казкі Леаніда Філатава. Тут усё сышлося: і выдатны літаратурны матэрыял, і цудоўнае яго ўвасабленне. Чым яшчэ падабаецца мне гэта анімацыя — яна з двайным дном, таму і дзеці, і дарослыя знойдуць для сябе штосьці каштоўнае.

4. «Дачка якудзы» Сяргея Бадрова-старэйшага і Гукі Амаравай. Нягледзячы на грозную назву, гэта прыгодніцкая камедыя пра адну маленькую японскую дзяўчынку, якая згубілася недзе паміж Уладзівастокам і Іркуцкам. Ёй трэба знайсці бацьку, чалавека неблагога, але па праве нараджэння вымушанага быць важаком якудзы. У выніку дзяўчынка знаходзіць і тату, і дарогу дамоў, і сяброў.

5. «Іван-царэвіч і Шэры Воўк» — зноў поўнаметражная анімацыя для дзяцей і дарослых. Гэты фільм працягвае стылістыку мультфільмаў пра асілкаў, але па сюжэце — зусім іншая гісторыя. Запамінальныя песні, каларытныя персанажы, жарты, над якімі працаваў вядомы квартэт «І» — атрымалася вельмі здорава!



БЕЗНАДЗЕЙНА... ХАТНІ,

або Што рабіць з «несадкоўскім» дзіцем?

■ Парады псіхолага

На пытанні чытачоў адказвае старшы выкладчык кафедры псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг-кансультант Алена ОСІПАВА.

«Гэтым летам у мяне заканчваецца водпуск па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў, таму да дзіцячага садка мы вырашылі падрыхтавацца крыху загадзя: ходзім у яслі з сакавіка. Але «ходзім» — гэта насамрэч гучна сказана. У суме не назбіраецца і 2 тыдняў, якія мой малы прабыў у групе. І гэта пры тым, што я адводжу яго ў садок максімум на дзве гадзіны, больш ніяк не атрымліваецца — ён пачынае плакаць наўзрыд, агрэсіўна сябе паводзіць, ірвецца да дзвярэй, каб апранацца і ісці дамоў. А дома з ім усё нармальна, у двары лёгка ідзе на кантакт, гуляе з іншымі дзецьмі. Напэўна, маё дзіця — «несадкоўскае». Што ж рабіць — можа, уладкавацца ў садок, куды ходзіць сын, памочнікам выхавальніка, каб быць побач з ім?»

Вольга Максімовіч, *г. Мінск.*

Вольга, сапраўдных «несадкоўскіх» дзяцей, на шчасце, не так ужо і шмат. У асноўным гэта дзеці з цяжкімі хранічнымі хваробамі. У прынцыпе, усе астатнія дзеці, нягледзячы на бясконцую разнастайнасць іх індывідуальных асаблівасцяў, суцэльна «садкоўскія». І трывожным, і аслабленым, і агрэсіўным, і чуллівым дзіцячы садок не супрацьпаказаны. Больш за тое — адхіленні ў паводзінах дзіцяці толькі ўзмацняюць неабходнасць у дзіцячым асяроддзі як важнай умове адаптацыі ў грамадстве.

Усякае змяненне ўмоў жыцця, што патрабуе адаптацыі, з'яўляецца моцным стрэсам для арганізма. Стрэс, у прыватнасці, праяўляецца ў тым, што дзіця слабее, у яго зніжаецца супраціўляльнасць да інфекцый. Да таго ж у дзіцячым калектыве значна вышэйшая верагоднасць інфіцыравання дзіцяці, чым дома. Усякі здаровы малы можа быць носьбітам мікраарганізмаў, на якія ён сам не рэагуе, бо для яго яны «свае», а для іншага яны могуць паслужыць прычынай хваробы. Мамы ж звычайна думаюць, што дзіця ў садку «прастудзілі».

Самае важнае, што варта мець на ўвазе: прычына пастаянных прастуд і хранічных ВРЗ часта не медыцынская, а псіхалагічная. Адзін з вядомых механізмаў псіхалагічнай абароны так і называецца — уцёкі ў хваробу. Толькі не трэба думаць, што дзіця прастуджваецца знарок, бо марыць застацца дома. Гэтае жаданне падсвядомае, ён не разумее сутнасці сваіх памкненняў. І арганізм падпарадкоўваецца гэтай утоенай тэндэнцыі, пачынае дэманстраваць дзіўную слабасць, з лёгкасцю трапляе пад усякі адмоўны ўплыў, адмаўляецца супрацьстаяць вірусам. Таму меры па загартоўванні і ўмацаванні арганізма, безумоўна, апраўданыя і мэтазгодныя; але не меншае значэнне маюць бацькоўскія намаганні па аднаўленні душэўнай гармоніі дзіцяці.

Адхіленні ў паводзінах дзіцяці толькі ўзмацняюць неабходнасць у дзіцячым асяроддзі як важнай умове адаптацыі ў грамадстве.

Часцей за ўсё схільныя да псіхалагічна цяжкай адаптацыі да дзіцячага садка дзеці, якія яшчэ дома ніяк не адпускалі маму ад сябе, а яшчэ больш верагодна, што мама сама мае павышаную трывожнасць і не адпускала ад сябе дзіця...

Якія захады могуць зрабіць бацькі ў такой сітуацыі? Па-першае, разабрацца са сваім уласным станам і сваімі страхамі: пакуль дзіця будзе адчуваць трывогу маці, яно будзе «несадкоўскім». Па-другое, неабходна мець упэўненасць, што не толькі ваша дзіця «падыходзіць» дзіцячаму садку, але і канкрэтны садок падыходзіць вашаму дзіцяці. Бацькам трэба пераканацца, ці дастаткова спрыяльная і камфортная для дзіцяці атмасфера выбранай дашкольнай установы. Важна таксама, якое ўражанне пакідаюць выхавальнікі. Калі выхавальніца вам несімпатычная, гэта яшчэ не значыць, што яна дрэнны прафесіянал і благі чалавек. Але гэта нагода задумацца, бо ваша першая, эмацыйная, ацэнка, хутчэй за ўсё, сведчыць пра сур'ёзнае разыходжанне ў поглядах, каштоўнасцях, самім стылі паводзін выхавальніка і бацькоў. І гэту няўзгодненасць дзіця можа ўспрымаць абвостраны, пакутліва падладжваючыся то пад адзін, то пад другі стыль. Калі атмасфера пэўнай дашкольнай установы вас не задавальняе, сур'ёзна падумайце аб пераводзе дзіцяці ў іншы садок. Але гэты крок прымальны толькі аднойчы ці двойчы. Калі ж у пошуках лепшага месца вы ператворыце жыццё дзіцяці ў качавое, то тым самым пазбавіце яго стабільнасці і ўведзяце ў бясконцы стрэс.

Не трэба пераацэньваць негатыўныя перажыванні дзіця. Вопытныя педагогі заўважаюць, што нават тыя дзеці, якія з рыданнямі ўпрошваюць маці не пакідаць іх у садку, праз некалькі хвілін пасля яе адыходу супакойваюцца і ўключаюцца ў гульні з сябрамі. Калі ж дзіця адчувае, што маці перажывае страх за яго, ці калі пратэстамі яму ўдалося пасеяць у сэрцы маці сумненні ці нават адчуванне віны, то яно з падвоенай настойлівасцю прымецца ўздзейнічаць на маці ўсімі даступнымі сродкамі. Каб гэтага пазбегчы, можна дамовіцца аб тым, каб дзіця ў садок адводзіў бацька — таты наогул больш цвяроза ставяцца да эмацыянальных рэакцый дзяцей.

Калі падчас дэкрэтнага водпуску вы пастаянна, неадлучна заставаліся побач з дзіцем, то цяпер пастарайцеся, каб з ім часцей былі тата, бабуля ці дзядуля. Прывучайце дзіця ненадоўга адпускаць вас, паступова павялічваючы працягласць сваёй адсутнасці. На гэты час важна, каб іншыя сваякі займалі малога цікавымі для яго рэчамі. Вы робіце правільна, пашыраючы кола стасункаў свайго дзіцяці.

Але можа здарыцца і так, што, нягледзячы на ўсе намаганні, не ўдасца пераадолець непрыняцце дзіцем садка. Калі абсалютна відавочна, што дзіцяці ў садку дрэнна, і мінусы грамадскага выхавання пераважаюць усе плюсы, усё адно не спяшайцеся навешваць на малога ярлык безнадзейна «дамашняга». Каб атрымаць параду, як выйсці з сітуацыі, лепш звярнуцца да спецыяліста-псіхолага на вочную кансультацыю.

У народзе кажуць: «МУЖЫК З ЖОНКАЙ СВАРЫЦЦА — У ГАРШКУ ТРАСЦА ВАРЫЦЦА».

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

НА ПАМЕЖЖЫ І РАЗДАРОЖЖЫ…

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Практычна адразу пасля выбараў прэзідэнта Украіны нас, гомельскіх журналістаў, запрасілі ў прэс-тур на Чарнігаўшчыну. Намеснік кіраўніка Чарнігаўскай гарадской рады Ганна Раманава, якая сама мае блізкіх сваякоў у Гомелі, у адной з сацыяльных сетак размясціла паведамленне пра тое, што колькасць беларусаў, якія прыязджаюць у Чарнігаўскую вобласць, скарацілася больш чым у два разы. Ад гэтага нясуць страты дробныя прадпрымальнікі, якія фактычна засталіся без заробку.

— Таксама да нас перасталі прыязджаць беларускія ўдзельнікі маладзёжных, спартыўных і культурных мерапрыемстваў, — паведаміла яна на сваёй старонцы. — Прычына адна: беларусы напалоханы абсурднымі «страшылкамі».

У пошуках жахаў

Усе выдаткі па арганізацыі прэстура ўзяў на сябе ўкраінскі бок, а менавіта кіраўнікі тых прадпрыемстваў, якія сёння церпяць страты ад адсутнасці беларусаў на чарнігаўскіх рынках. Акрамя журналістаў, ва Украіне пабывалі прадстаўнікі прафсаюзаў і турыстычных фірмаў. Нам шчыра імкнуліся паказаць усё, што было магчыма за дзень. Мы пагутарылі з гандлярамі на рынках і прадстаўнікамі ўлады. Для нас сабралі ўсіх сілавікоў, якія ў адзін голас запэўнівалі, што сітуацыя пад кантролем і яны асабіста даюць гарантыі бяспекі кожнаму беларусу, які перасячэ мяжу Чарнігаўшчыны:

— Мы гатовы сустракаць беларускіх прадпрымальнікаў на мяжы з аховай і суправаджаць да рынка, — распавёў супрацоўнік адміністрацыі. — Толькі б яны зразумелі, што тут усё спакойна.

Прынамсі, статыстыка чарнігаўскага боку такая: за суткі праз памежны пункт пропуска Новыя Ярылавічы (беларуская Новая Гута) праязджае ў абодвух напрамках каля 90 легкавых машын — прыкладна ўдвая менш, чым год таму. На мяжы і мы пабачылі пустыя калідоры. Адразу некалькі чалавек у камуфляжнай і чорнай формах корпаліся вакол адзінага нятаннага аўто з беларускімі нумарамі. BMW X5 «прасвяцілі» практычна наскрозь, і неўзабаве аўтамабіль накіраваўся ў бок Украіны.

Украінскія памежнікі з «калашнікавымі» наперавес выглядаюць грозна. Паўсюль на тэрыторыі прапускнога пункта Новыя Ярылавічы знаходзяцца мяшкі з пяском. Усё гэта нагадвае сапраўдныя абаронныя збудаванні. Асцярожныя беларусы, між іншым, спужацца могуць. І будуць чакаць, пакуль прыкметы вайны знікнуць зусім.

Жоўта-блакітныя фіранкі і агароджы

Далей да самага Чарнігава абышлося без прыгод. Разбітая двухпалосная дарога ідзе ўздоўж падлескаў, на якіх гадоў дваццаць таму, напэўна, вырошчваліся сельскагаспадарчыя культуры. Цяпер тут шумяць маладыя гайкі. Прырода абнаўляецца і вяртаецца да спрадвечнасці. Праўда, нельга тое ж сказаць пра будынкі. Працэс іх дэградацыі — на фасадах. Калісьці нашы суседзі славіліся сваімі акуратнымі дамкамі з прыгожымі кветнікамі. Сёння нават некаторыя капітальныя пабудовы прыходзяць у заняпад і стаяць з выбітымі «вачніцамі». З убачанай «цяжкай» тэхнікі — савецкі танк на пастаменце каля шашы, а на дарозе — трактар «Беларус», упрыгожаны жоўта-блакітным сцяжком.

Сцяжкі і стужкі мы потым бачылі паўсюль. Яны закрываюць вокны замест фіранак. Як бялізна, боўтаюцца на балконах. Кавалкамі стужак абвязаны агароджы. І зразумела ж, стужкі літаральна з'яўляюцца вянцом нацыянальнага строю. Дарэчы, якраз у такія строі былі апрануты дзве жанчыны, якія, па агульнай славянскай традыцыі, сустрэлі нас на мяжы Чарнігаўшчыны з піснямі і хлебам-соллю.

З убачанай «цяжкай» тэхнікі — савецкі танк на пастаменце каля шашы, а на дарозе — трактар «Беларус», упрыгожаны жоўта-блакітным сцяжком.

Увогуле ж, цікава зрабіць крок у мінулае і апынуцца прыкладна ў сярэдзіне 1980-х. Мы ўжо забылі, што прыкладна так, як сёння ў Чарнігаве, выглядалі нашы вуліцы, дамы і дарогі 30 гадоў таму. Неабкошаныя абочыны і газоны, кінутыя даўгабуды, смецце там і сям… Нягледзячы на пэўныя нязручнасці, гэтыя асаблівасці адназначна не спыняць падарожнікаў-беларусаў, якія любяць часам настальгіраваць і параўноўваць. Тым больш, украінцы самі даюць нагоду і ў прыватных гутарках прызнаюцца, што афіцыйна плацяць не больш за 30% неабходных падаткаў. Адкуль той сацыялцы быць?

— Нам бы вашага «Бацьку», — кажуць. — Гады на два.

Але ж нават «тэарэтычна» любы кіраўнік, каб навесці хоць нейкі парадак, павінен закручваць гайкі: прымушаць плаціць падаткі, выводзіць бізнес з ценю, прымушаць працаваць тых, хто адвык гэта рабіць… Здаецца, да такога суседзі не вельмі гатовы. Ім, як гэта ні парадаксальна, адначасова патрэбны вольніца і… цар. Іх чаканні звязаны з харызматычнай асобай, якая без іх асабістага ўдзелу рукамі «развядзе» эканамічныя праблемы, назапашаныя за апошнія дзесяцігоддзі.

Спрэчкі касы не зробяць

Новая аптова-рознічная база ў Чарнігаве была пабудавана спецыяльна для беларусаў, але цяпер на кожных другіх дзвярах — прапанова пра продаж або арэнду памяшкання. А значыць, уладам прыйдзецца клапаціцца аб будучым працаўладкаванні супрацоўнікаў рынка. Пра гэта баліць галава і ў мэра Чарнігава Аляксандра Сокалова, які шчыра прызнаўся на сустрэчы з беларускімі журналістамі, што страта пакупнікоў з нашай краіны — сур'ёзны ўдар па эканоміцы горада. Сярэдняя зарплата ў суседзяў цяпер складае каля 2,5 тысячы грыўняў — па новым курсе гэта менш за 210 долараў. Прамысловасць працуе слаба, і многія едуць на заробкі ў Кіеў.

Пры гутарках гандляры імкнуліся з усіх сіл устрымлівацца ад тэм палітычных. Зразумелі, што дыскусіяй з пакупнікамі каля гары рэчаў, якія не купляюць, грошай не заробіш. Прызналіся, што цяпер сядзяць ціха і чакаюць, калі новая ўлада праявіць сябе.

За час кароткай экскурсіі па рынку «Ніва» мы паспелі не толькі пагутарыць на розныя жыццёвыя тэмы, але і набыць нейкія рэчы. Коштавая розніца існуе, а ў некаторых выпадках — даволі істотная. Дзіцячы веласіпед мая калега набыла за 50 долараў. У Беларусі ён каштуе амаль у два разы даражэй. Адназначна спакуснымі сёння пададуцца і іншыя цэны. На фоне нашага падаражання мяса тут таннейшае ў два, а то і тры разы. Прынамсі, як і алкаголь, якога, вядома, шмат не вывезеш. Згодна з заканадаўствам — толькі 3 літры на чалавека.

— Цэн мы не павышалі. Курс выгадны — амаль 12 грыўняў за долар. Усё ў нас добра і мірна, толькі беларусаў вельмі не хапае, — кажуць прадаўцы на рынках і шчыра, вельмі шчыра запрашаюць на шопінг.



Пункт пропуску Новыя Ярылавічы.

Чарнігаў пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Справа — крама-даўгабуд, злева — рэстаран «Кныр».

Прадаўцы на рынку чакаюць беларускіх пакупнікоў.

Мікрааўтобус з беларускімі нумарамі на рынку адразу ж прыцягнуў увагу. Яго кіроўца Уладзімір расказаў, што ездзіць ва Украіну пастаянна. Не змяняў звычцы нават у лютым, калі чарговыя лёсавызначальныя падзеі адбываліся на кіеўскім Майдане:

— Бываю тут практычна кожны дзень, прывожу людзей у Чарнігаў, а заадно і сам закупляюся. Часам выязджаю і ў Кіеў, але ў Барыспаль цяпер наведваюся рэдка. Кліентаў, вядома ж, страціў. Усё таму, што чуткі розныя ходзяць: маўляў, украінцам зарплату не плацяць і яны выходзяць рабаваць кіроўцаў. Мы толькі ўсміхаемся…

Валюта ў чарнігаўскіх абменніках ёсць. Вольныя валютчыкі, між іншым, навыперадкі кідаюцца на магчымага шапаголіка. Праўда, ніхто з іх пры выказванні самых цёплых пачуццяў да беларусаў не пажадаў памяняць на грыўні беларускія рублі. А яшчэ, калі ў цэнтры горада спатрэбілася пасля 18 гадзін абмяняць грошы, «мянялы» паспелі пакінуць звычайныя «месцы працы». Раней жа яны стаялі тут «цілодобова» (у перакладзе з украінскай — у любы час дня і ночы).

Еўрапейскі «Кныр» і вакантны пастамент

Тры тыдні таму ў Чарнігаве адкрылі новы прыватны рэстаран «Кныр», які спецыялізуецца на мясе пад піва. Будынак пафарбаваны ў «мясны» колер, на сценах у бантакетнай зале — «партрэты» свіней у разнастайных мастацкіх вобразах. Прадуманы і дробязі: колер і фактура посуду, карта страў, прыгожая ўніформа афіцыянтаў… Гумавыя пальчаткі на руках кухараў, спецыялізаванае экалагічнае абсталяванне для гатавання ежы — быццам у іншую краіну трапілі!

Але ж від з ганка гэтай установы вяртае да чарнігаўскай рэчаіснасці. Насупраць на шыльдзе вялізнай крамы-даўгабуда чорнай фарбай напісана па-руску: «Денег нет». Дарэчы, паўсюль размаўляюць менавіта на гэтай мове, якая стала каменем спатыкнення ў канфлікце адных украінцаў з іншымі ўкраінцамі. Прыкметы нямірнага стану пакуль захоўваюцца, хоць і лічыцца, што тут, на поўначы, «гарачага» высвятлення, які сектар мае рацыю, не было. Там-сям агароджы распісаны знакамі і заклікамі пэўнага зместу, не паўсюль сарваны перадвыбарныя плакаты. Свабодным стаў пастамент, на якім зусім нядаўна знаходзілася магутная фігура правадыра сусветнага пралетарыяту. Народ і ўлады па Леніну не сумуюць, а разважаюць, хто зойме вакантнае месца. Прапаноў хапае. Мяне асабіста зачапіў іншы помнік-стэла, да якога відавочна зарасла народная сцяжынка. На ім — чырвоныя зоркі, якія даўно не бачылі фарбы, і знявечаныя надпісы гарадоў-герояў, у ліку якіх і Мінск. Вышэй — тое, што засталося ад выявы ордэна Вялікай Айчыннай. Мой дзед-украінец Якаў Талочка, які загінуў у баях за агульную радзіму ў 1943 годзе, гэтага б не зразумеў…

Адназначна спакуснымі сёння пададуцца цэны. Мяса ў Чарнігаве таннейшае ў два, а то і тры разы.

Пад пытальнікам пакуль застаюцца многія культурныя стасункі, якія наладжваліся дзесяцігоддзямі. У тым ліку правядзенне традыцыйнай чэрвеньскай сустрэчы моладзі Беларусі, Украіны і Расіі. Не ўсе бакі гатовы зноў дэманстраваць славянскае адзінства.

— Пакуль што ўкраінскі бок устрымліваецца ад удзелу, — выказвае афіцыйную думку мэр Чарнігава Аляксандр Сакалоў. — Чалавечыя адносіны паміж намі не змяніліся. Маем жа агульныя сувязі, карані, святы. У Чарнігава шмат гарадоў-пабрацімаў. У іх ліку — Мыцішчы, Бранск, Гомель і іншыя. Усе хочуць, каб было мірна і спакойна. Але ж у гэтай сітуацыі праводзіць мерапрыемства не зусім этычна. Некаторыя рэчы будуць не зусім шчырымі. На жаль. Мы зацікаўлены, каб была стабільнасць на ўкраінскай зямлі.

Мы — таксама. Улічваючы банальную ісціну пра сваякоў і сяброў, якія ёсць літаральна ў кожнага беларуса — як ва Украіне, так і ў Расіі. Не хачу, каб яны паміж сабой сталі ворагамі! Лягчэй погляды падкарэктаваць.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 18 июля 2014 г.

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Инженерная инфраструктура *	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Боровлянский с/с, д. Скураты, участок № 3	623680607601000043	0,1394 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	3 307 500	180 000 000	36 000 000
2	Ждановичский с/с, д. Дегтяревка	623681702101000300	0,1200 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ	6 410 000	329 000 000	65 800 000
3	г. Заславль, ул. Солнечная, 45	623650100001004812	0,1005 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	6 680 231	144 000 000	28 800 000
4	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, квартал 7105, участок № 8	623683403101006497	0,1487 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	741 000	133 000 000	26 600 000
5	Луговослободской с/с, д. Обчак	623684109101000706	0,1500 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество, газ, водопровод	6 128 232	131 000 000	26 200 000
6	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 8	623684200601000043	0,1561 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	585 000	74 000 000	14 800 000
7	Острошицко-Городокский с/с, д. Буденного	623685201601000166	0,1520 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	1 000 000	101 000 000	20 200 000
8	Петришковский с/с, д. Кирши	623685704101000173	0,1414 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	газ	390 000	190 000 000	38 000 000
9	Самиохваловичский с/с, д. Русиновичи	623686303101000191	0,0956 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	6 600 000	60 000 000	12 000 000
10	Сеницкий с/с, аг. Атолино, участок № 289	623686600601000454	0,1558 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	-	450 000	183 000 000	36 600 000
11	Хатежинский с/с, аг. Хатежино	623687508101001300	0,1400 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	5 347 476	220 000 000	44 000 000
12	Шершунский с/с, д. Ашнарово	623685800601000058	0,1421 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	7 783 500	30 000 000	6 000 000
13	Шершунский с/с, д. Бахметовка	623685801101000052	0,1289 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	-	7 704 800	16 000 000	3 200 000
14	Щомыслицкий с/с, д. Городище, участок № 34	623688001601000518	0,1387 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	электричество	795 000	122 000 000	24 400 000
15	Юзуфовский с/с, д. Шепели	623688208601000144	0,1473 га	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	электричество	6 243 500	77 000 000	15 400 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. **Дата проведения:** 18.07.2014 г. в 10:00. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9:00 до 17:00 по адресу:** г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. **Окончание приема заявлений и документов:** 14.07.2014 г. в 17:00. **Контактный телефон: 204-11-62.**

Задаток за участие в аукционе на **лот 1** перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 Боровлянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На лот 2 перечисляется на расчетный счет № 3641621030047 Ждановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На лот 3 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 Заславского горисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На лот 4 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 Колодищанского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На лот 5 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 Луговослободского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На лот 6 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 Михановичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На лот 7 перечисляется на расчетный счет № 3641000000047 Острошицко-Городокского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901.

На лот 8 перечисляется на расчетный счет № 3641900000277 Петришковского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

На лот 9 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 Самохваловичского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На лот 10 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 Сеницкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

На лот 11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На лоты 12-13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000059 Шершунского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052358, код платежа – 04901.

На лот 14 перечисляется на расчетный счет № 3641000000076 Щомыслицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901.

На лот 15 перечисляется на расчетный счет № 3641900000147 Юзуфовского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052332, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2. соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка;

4. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

4.1. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается несостоявшимся в случаях, если: заявление об участии в аукционе подано только одним участником аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов); для участия в аукционе не было подано ни одного заявления; на аукцион явился один из участников или ни один из участников не явился на аукцион.

Аукцион в отношении каждого земельного участка признается нерезультативным в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона не предложил свою цену.

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Результаты аукциона аннулируются, если победитель аукциона в установленный срок: не внес плату за земельный участок; не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не выполнил условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, а также иные условия участия в аукционе. При этом внесенный победителем аукциона задаток возврату не подлежит.

**** в разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.***

РЕКЛАМНАЯ ИГРА «Решите все онлайн»

Приорбанк RZB Group

1. Сведения об организаторе рекламной игры.

«Приорбанк» ОАО, УНП 100220190, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Свидетельство о государственной регистрации произведено Национальным банком Республики Беларусь 12.07.1991 года, регистрационный номер 12, регистрационный номер в ЕГР 100220190.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 12 от 06.05.2013 г.

2. Наименование рекламной игры.

«Решите все онлайн» (далее – рекламная игра).

3. Место (территория) проведения рекламной игры.

Республика Беларусь.

4. Срок начала и окончания рекламной игры.

С 20 июня 2014 года по 31 декабря 2014 года (включая период розыгрыша и выдачи призов). Игра проводится в шесть этапов.

5. Цель рекламной игры.

Игра проводится в целях стимулирования роста количества клиентов и безналичных расчетов в системе Интернет-Банк PiorOnline.

6. Состав комиссии по проведению рекламной игры.

Председатель комиссии:

Шишов Сергей Иванович, Заместитель Председателя Правления Приорбанк» ОАО.

Члены комиссии:

Павлович Анатолий Анатольевич, исполнительный директор «Приорбанк» ОАО;

Лазюк Сергей Сергеевич, директор департамента электронных каналов и сопровождения продаж «Приорбанк» ОАО;

Осиповский Евгений Александрович, начальник отдела электронных каналов продаж департамента электронных каналов и сопровождения продаж «Приорбанк» ОАО;

Романчук Алексей Петрович, начальник отдела маркетинга и общественных связей «Приорбанк» ОАО;

Крюковская Татьяна Михайловна, начальник управления УП «Дом Офис 2000» .

7. Состав и размер призового фонда рекламной игры.

Призовой фонд рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества организатора.

Разыгрываются призы общей стоимостью 44 092 500 (сорок четыре миллиона девяносто две тысячи пятьсот) белорусских рублей *(Табл. 1):*

Таблица 1. Состав и размер призового фонда.

Этап игры	Наименование приза	Цена за единицу с НДС, бел. руб.	Кол-во, шт.	Общая стоимость с НДС, бел. руб.
1	Велосипед LTD Rocco 40 26"MTB Men"14	3 525 000	1	3 902 727
	денежный приз	377 727	1	
2	Велосипед LTD Rocco 40 26"MTB Men"14	3 525 000	1	3 902 727
	денежный приз	377 727	1	
3	Велосипед LTD Rocco 40 26"MTB Men"14	3 525 000	1	3 902 727
	денежный приз	377 727	1	
4	Apple iPad Air Wi-Fi + Cellular 16 ГБ	9 590 000	1	10 794 773
	денежный приз	1 204 773	1	
5	Apple iPad Air Wi-Fi + Cellular 16 ГБ	9 590 000	1	10 794 773
	денежный приз	1 204 773	1	
6	Apple iPad Air Wi-Fi + Cellular 16 ГБ	9 590 000	1	10 794 773
	денежный приз	1 204 773	1	
ИТОГО:				**44 092 500**

8. Участники рекламной игры.

Участниками игры становятся физические лица, граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, подключившиеся к системе Интернет-банк Prior Online.

Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

9. Порядок участия в рекламной игре.

Для участия в каждом этапе рекламной игры необходимо в указанные сроки *(Табл. 2)* совершить в системе Интернет-банк PriorOnline минимум одну операцию по безналичной оплате товаров/работ/услуг на сумму не менее 300 000 белорусских рублей.

Таблица 2. Порядок участия в рекламной игре.

Этап игры	Начало расчетов	Конец расчетов
Этап 1	20.06.2014	16.07.2014
Этап 2	17.07.2014	12.08.2014
Этап 3	13.08.2014	08.09.2014
Этап 4	09.09.2014	05.10.2014
Этап 5	06.10.2014	01.11.2014
Этап 6	02.11.2014	30.11.2014

Не является основанием для участия в Игре проведение безналичных операций в организациях торговли и сервиса, в учреждениях банков, банкоматах, инфокиосках, отделениях РУП «Белпочта», РУП «Белтелеком», переводы денежных средств с карты на карту, операции по погашению кредитов и оплате банковских комиссий.

10. Место, дата и порядок розыгрыша призов рекламной игры.

Победитель будет определяться в центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: ул. В. Хоружей, 31А согласно графику, приведенному в *Таблице 3:*

Таблица 3. Даты розыгрышей призов.

Этап игры	Период расчетов	Дата розыгрыша	Призы
Этап 1	20 июня – 16 июля 2014	21.07.2014 в 14:00	1 приз 1-го этапа
Этап 2	17 июля – 12 августа 2014	15.08.2014 в 14:00	1 приз 2-го этапа
Этап 3	13 августа – 8 сентября 2014	11.09.2014 в 14:00	1 приз 3-го этапа
Этап 4	9 сентября – 5 октября 2014	08.10.2014 в 14:00	1 приз 4-го этапа
Этап 5	6 октября – 1 ноября 2014	05.11.2014 в 14:00	1 приз 5-го этапа
Этап 6	2 ноября – 30 ноября 2014	03.12.2014 в 14:00	1 приз 6-го этапа

11. Механика проведения розыгрыша.

К моменту розыгрыша данные об участниках рекламной игры формируются Организатором в список участников по дате и времени совершения операции. Все порядковые номера имеют одинаковую разрядность. Для проведения розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера получателя приза происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера секретарь помещает в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера участника игры в списке. Секретарь извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера. После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в списке участников и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и секретарь извлекает следующий шар.

Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в списке участников.

Итоги розыгрыша призов рекламной игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

12. Порядок, дата и время выдачи призов по итогам розыгрыша рекламной игры.

После проведения розыгрыша организатор уведомляет победителей о выигрыше по телефону и по почте не позднее 5 рабочих дней с момента проведения розыгрыша.

Победитель каждого розыгрыша рекламной игры имеет право согласиться на получение приза или отказаться от приза.

Сроки выдачи призов указаны в *Таблице 4:*

Таблица 4. Порядок вручения призов.

Этап игры	Дата розыгрыша	Сроки вручения призов (включительно)
Этап 1	21.07.2014	05.08.2014
Этап 2	15.08.2014	30.08.2014
Этап 3	11.09.2014	26.09.2014
Этап 4	08.10.2014	25.10.2014
Этап 5	05.11.2014	20.11.2014
Этап 6	03.12.2014	18.12.2014

Для получения необходимо предъявить паспорт (документ, удостоверяющий личность) в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31 А.

В случае отказа победителя от получения приза, невыполнения победителем требований правил рекламной игры, или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке, победитель теряет право на получение приза, и приз остается в распоряжении организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата стоимости призов наличными денежными средствами не производится.

Удержание с победителей рекламной игры подоходного налога, исчисленного организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза.

13. Публикация.

Правила проведения рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала рекламной игры, а также размещению на корпоративном сайте организатора www.priorbank.by.

Результаты розыгрышей рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» до 31.12.2014, а также размещены на корпоративном сайте Организатора www.priorbank.by.

14. Контактная информация.

Телефон для справок в период проведения рекламной игры: (017) 289 90 90.

Свидетельство № 2396 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 13 июня 2014 Министерством торговли Республики Беларусь.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Васіль Ткачоў — пісьменнік, якога прадстаўляць чытачам «Звязды», спадзяюся, няма асаблівай патрэбы. Прынамсі, тым, хто цікавіцца беларускай літаратурай. Паколькі ў айчынным прыгожым пісьменстве Васіль Юр'евіч працуе ўжо не адзін дзясятак гадоў, напісаў і выдаў больш за дваццаць кніг (у тым ліку і для дзяцей) прозы, драматургіі і публіцыстыкі. Яго творы былі адзначаны некалькімі прэстыжнымі прэміямі: напрыклад, прэміяй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры. І ўсе гэтыя творчыя гады ён актыўна распрацоўвае тэму жыцця і лёсу звычайнага, простага чалавека. Часам яго апавяданні вельмі вясёлыя, часам — крыху сумныя. Некаторыя з іх аўтар называе кароткімі былямі, маленькімі гісторыямі, сітуацыямі, тым самым падкрэсліваючы, што іх вытокі — у нашай паўсядзённай рэчаіснасці.

Алесь БАДАК.

Васіль ТКАЧОЎ

ПРАВОДЗІНЫ

Антонавіч чакаў унука Максіма. З хвіліны на хвіліну той павінен быў забегчы, каб развітацца. Унук ішоў у армію. Стары пашоргаў да акна, паглядзеў на двор, запруджаны легкавікамі. Людзей сярод іх сноўдалася мала, у асноўным, хіба ж не бачна, пенсіянеры нетаропка накіроўваліся ў бок ашчадбанка і аддзялення сувязі, яны побач, — каб атрымаць пенсію. Яшчэ ўчора пачалі выдаваць. І яму б схадзіць, але занядужаў. Хварэе і жонка: яе наогул забрала колькі дзён таму «хуткая». «Нічога, — разважаў Антонавіч, — пенсія пачакае, цалей будзе. Сёння ў яго галоўны клопат — унук». Зноў паглядзеў у акно: не відаць. Хацеў было пацікавіцца, чаму затрымліваецца, пацягнуўся па мабільнік, але перадумаў: хіба ж у яго, Максіма, мала спраў? Прыбяжыць. Як гэта — каб дзеда абмінуў? Такога не можа быць: у іх свае стасункі, яны — дружбаны яшчэ тыя. Пакуль унук недзе бавіцца, Антонавіч думае пра ўнука. Дзіўны ён усё ж хлапец. Але — малайчына. Калі нехта стараецца «адкасіць» ад арміі, той даўно, яшчэ некалькі гадоў таму, заявіў: «Пайду служыць! Абавязкова! І толькі ў дэсантнікі!» Звязаўся нейкім чынам з такімі, як сам, экстрэмаламі, скакаў з моста цераз Сож, ездзіў у Васілевічы, каб і там скокнуць з закінутай вежы. Потым усё гэта выклаў у інтэрнэце. Пахваліўся і дзеду.

У Антонавіча быў здзіўлены твар. Ён і не пахваліў унука, і не лаяў, а толькі падумаў: «І ў каго ён удаўся? Хіба ж я з той вежы скокнуў бы? Ды нізашто! Забі мяне, а не адважуся…» Пазней, праўда, сваю боязь апраўдваў гадамі, старасцю. А каб быў маладым, як Максім, магчыма, таксама адважыўся б. Хто яго ведае — як было б, калі б ды каб… А ён вось, унук, збіраўся стаць дэсантнікам. Гантэлі неяк прынёс. «Дзед, не хочаш пазаймацца?» Антонавіч адно што ўсміхнуўся ў адказ: «Мне яшчэ толькі гэтага не хапала!» Аднак з дэсантам у Максіма нічога не атрымалася: медыцынская камісія была супраць, не дала «добро», і тады яму прапанавалі вучыцца ад ваенкамата на вадзіцеля. Паспрыяла гэтаму, відаць, і тое, што ў яго былі на той час правы аматара. Тут наогул цікава атрымалася. Пасля школы Максім аднёс дакументы ў прафесійна-тэхнічны каледж, дзе навучаўся па дзвюх спецыяльнасцях — майстар па халадзільных установках і слесар-зборшчык. Практыку праходзіў на заводзе ліцця і нармаляў. Там хлопца заўважылі і прапанавалі пасля вучобы застацца ў іх. А куды, і сапраўды, яму было кідацца, калі напярадзе — армія? Пагадзіўся. За тыя пяць месяцаў, што працаваў слесарам-зборшчыкам, а не біў лынды, як некаторыя, вывучыўся і на шафёра-аматара. Ні ў каго ніводнай капейкі не папрасіў. Антонавіч неяк было заікнуўся, ці не дапамагчы яму грашыма, — усё ж цяпер навука гэтая не надта танна каштуе. Аднак той далікатна ўхіліўся: «Я сам, дзядуля, мне ж добра плацяць». Ну добра дык добра. Тое-сёе з адзення справіў. І набыў сабе смартфон амаль за чатыры мільёны рублёў. Вось гэтага Антонавіч не ацаніў. Навошта такая дарагая рэч, ды яшчэ перад арміяй? Унук жа спакойна заявіў: «У армію вазьму з сабой». — «Вазьмі, вазьмі, там цябе з такой цацкай толькі і чакаюць стараслужачыя — умомант адбяруць». — «Не адбяруць. Цяпер не той час. Я пытаўся ў тых, хто служыў. Сказалі: маўляў, бяры любы мабільнік, ніхто не паквапіцца. У капцёрцы ёсць сейф, там іх і захоўваюць. А даюць карыстацца толькі ў нядзелю. Ну, зразумеў, дзядуля?»

Што ж тут не зразумець? Шчыра сказаць, дык з «дзедаўшчынай» і ён не сустракаўся ў арміі, хоць і служыў калі — страшна ўявіць: амаль пяцьдзясят гадоў таму. Прызваўся ў шэсцьдзясят сёмым — тады армія, тады яшчэ савецкая, якраз пераходзіла на двухгадовы тэрмін службы, і ў казарме былі стараслужачыя воіны, якія захапілі крышачку і чацвёртага года. Яны жылі дэмабілізацыяй і на вячэрнюю прагулку, вядома ж, не выходзілі. Аднак калі цікавіўся, як праходзіць у роце вячэрняя прагулка, дзяжурны па часці афіцэр, то яны моўчкі бралі ў капцёрцы сваіх чарапах (служыў Антонавіч у Туркменіі), выносілі іх на плац: колькі прапаўзе за час прагулкі чарапаха — столькі і яны пройдуць. Пацеха, не болей. Усё ж гэтых стараслужачых разумелі і многае ім даравалі: яны сваю вайсковую навуку засвоілі, нават крыху звыш таго, пара хлопцам дадому, і вы, маладыя, маўляў, не глядзіце на іх.

Добра запомнілася яму, Антонавічу, і як першы Новы год сустракаў у казарме. Выстраіліся ў адну шарэнгу «салагі», «чарпакі» і «старыя». З іншага пакоя — там, дзе стаялі ложкі, — пасля каманды «Смірна, раўненне налева!» — двое салдат вывозяць на палацёры стараслужачага са згорнутым лістом ватмана пад пахай. Той вітаецца: «Прывітанне, таварышы «салагі»!» Салдаты адказваюць. Так вітаецца і з «чарпакамі» — салдатамі, што адслужылі год. Ну, а са стараслужачымі камандуючы своеасаблівым навагоднім парадам вітаўся з кожным за руку. А потым разгортваў ліст ватмана і зачытваў загад па казарме… Усё гэта зводзілася да жартаў. Смеху было — не перадаць! Пазней прыходзіў у казарму камандзір роты і па-сапраўднаму віншаваў усіх з Новым годам.

Нарэшце з'явіўся унук.

— Ну што, дзед, давай развітацца? — пераступіўшы парог, адразу ўсміхнуўся ён, і Антонавіч адчуў, як на вачах успыхнулі слязінкі. — З бабуляй развітаўся. Разам з Ульянай былі ў яе толькі што ў палаце. Сказала, каб ты сёння да яе не прыходзіў: у яе ўсё ёсць. Тата з мамай сёння ранкам былі ў бабулі, занеслі ёй што трэба.

— Куды ж я ўжо пайду?.. — стары зусім неяк скурчыўся, безнадзейна махнуў рукой, пэўны час глядзеў на Максіма і не бачыў выразна яго твар: вочы па-ранейшаму туманіла вільгаць. Калі здагадаўся змахнуць здрадніцкія слязінкі, мякка, але патрабавальна загадаў унуку: — Прысядзь.

— Ды няма калі, дзед! Мяне ж сябры чакаюць!

— Перад дарогай трэба пасядзець. Прысядзь, прысядзь. Нікуды твае сябры не дзенуцца.

— Яны і на прысягу прыедуць.

— Гэта добра. Значыць, харошыя хлопцы. Але калі яшчэ будзе тая прысяга, а ты мяне паслухай, старшага сяржанта запасу, зараз.

Максім лагодна ўсміхнуўся, сеў на табурэт:

— А я і не ведаў…

— А што, на картках не бачыў хіба мяне з лычкамі?

— Хаця праўда. Але неяк не прыдаваў значэння.

Дзед — і старшы сяржант? Хм!..

— Так, так. У поўным запасе. На мяне там не разлічвайце… Не буду табе я нічога казаць. Хлопец ты разумны — сам усё ведаеш. Але нейкія праводзіны сёння ў армію не такія, як хацелася б… як раней былі… Ого, якія раней праводзіны былі ў армію! Што ты! Калі я ішоў, то ўся вёска выходзіла на вуліцу. Я да кожнага чалавека падыходзіў, і ўсе, усе, унук, як адзін чалавек, жадалі мне добрай службы… Многія абдымалі, а жанкі нават цалавалі і плакалі… Ну як я мог пасля гэтага схібіць, не так рабіць нешта ў арміі? І ўсіх так, як мяне, праводзілі… Усіх… Можа, таму, што нацярпеліся людзі ў вайну, добра ведалі, што такое салдат? Амаль усе яны, землякі, вайну перажылі… Нацярпеліся… Хапіла ліха ім…

— Я пайду, дзядуля? — унук устаў з табурэта, абняў Антонавіча, адвярнуўся, і стары таксама ўбачыў на яго твары слёзы.

— Ідзі, Максім, — ціха прамовіў Антонавіч. — Прабач, што не магу цябе правесці: занядужыў, як на тое ліха, бачыш жа.

— Ды што ты, дзядуля! Тата з мамай прыйдуць на вакзал да цягніка. Дзядзька Юрка.

— Ідзі. З Богам!

